

РОДНЫЯ КРАЯВІДЫ ВАЧЫМА МАЛАДОЙ МАСТАЧКІ

ЧЫРВОНКА

У БАНКАЎСКАЙ СФЕРЫ МАГЧЫМАСЦЯЎ ЗВЫШДАСТАТКОВА

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ЖНІЎНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 158 (30038)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Дзмітрый КРУТОЙ, пасол Беларусі ў Расіі:**

*«Наконт грамадзянскага самалёта, які непасрэдна будзе выраблядца ў Беларусі: на сёння пачаты праектныя работы. Пакуль гаварыць канчаткова аб мадэлі, аб'ёмах фінансавання і нават умяшчальнасці гэтага самалёта рана. Да канца года будзе праведзена вось гэта доследная, скажам так, праектная работа, і потым ужо будзе нейкая канкрэтыка».*

## КОРАТКА

- **Фестываль навукі правядуць у Мінску 2 верасня.**
- Больш як 40 працэнтаў малых і сярэдніх арганізацый і амаль 30 працэнтаў ІП краіны зарэгістраваны ў Мінску.
- **У Беларусі завяршылі дэталёвую разведку базальтаў Навадворскага радовішча.**
- Літва часова закрые два КПП на граніцы з Беларуссю з 18 жніўня.
- **Кабінет камп'ютарнай тамаграфіі адкрылі ў Жыткавічах. Рэнтгенаўскі камп'ютарны тамограф — на 64 зрэзы. Гэта першы апарат КТ у раёне.**
- Мінфін Беларусі 24 жніўня правядзе аўкцыён па размяшчэнні імянных аблігацый у юанях.
- **У Віцебскай вобласці вызначылі тэрміны нарыхтоўкі брусніц і журавін. Сезон збору брусніц у рэгіёне стартуе з 16 жніўня, журавін — з 13 верасня.**
- Арыштаваны транспарт даўжніка, які перасякае граніцу, будуць перадаваць судовым выканаўцам.

ISSN 1990 — 763X

# Чатырохтысячнікі — гэта гучыць!



Фота БелТА.

У ААТ «Кухчыцы» Клецкага раёна жніво практычна завершана: па стане на 15 жніўня тут убрана 94,5 працэнта плошчаў збожжавых. Камбайнеры Сяргей ЯНУЧОК і Віктар ЖУКОЎСКІ ўжо могуць пахваліцца новым рэкордам: летась яны намалацілі тры з паловай тысячы тон, а сёлета — усе чатыры.

Што ў меню?

## ЗАМЕСТ ГАМБУРГЕРА — ГАРАЧЫ БУТЭРБРОД

**Што паказаў эксперымент у школьным харчаванні і якім яно будзе ў новым навучальным годзе?**



**Эксперымент па ўдасканаленні школьнага харчавання, які праводзіўся ў некаторых школах краіны летась, адобраны як вучнямі і іх бацькамі, так і на ўзроўні ўрада. Таму яго вырашана распаўсюдзіць на ўсе школы. Спецыялісты прыйшлі да высновы, што такое харчаванне з'яўляецца паўнавартасным, якасным і бяспечным і, што немалаважна, падабаецца школьнікам, а, адпаведна, у адходы адпраўляецца зусім нязначная частка прадуктаў. Так, у меню не будзе гамбургераў і чызбургераў, але цалкам магчымы падобны на іх гарачы бутэрброд. Нічога супраць не маюць спецыялісты і наконт піцы, праўда, і яна ў меню будзе нячаста.**

### НОВАЕ ХАРЧАВАННЕ РАСПАЎСЮДЗЯЦЬ НА ЎСЕ ШКОЛЫ

Як адзначыла **начальнік аддзела па арганізацыі харчавання Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Люцыя МІХАЛЬЧУК**, звыш мільёна школьнікаў у Беларусі атрымлівае школьнае харчаванне. Пры гэтым бясплатнае аднаразовае, двухразовае ці трохразовае харчаванне атрымлівае 17 катэгорый школьнікаў, а гэта больш за 750 тысяч дзяцей. Яшчэ 350 тысяч харчуецца за бацькоўскую плату.

СТАР. 3

Спажывец

## ХТО Ў ЛЕС, ХТО ПА ГРЫБЫ

**Ідзём на ціхае паляванне, пакуль што на рынак. Колькі грошай браць з сабой?**

**Грыбны сезон у Беларусі стартаваў у трэцяй дэкадзе ліпеня, калі пасля халодных дажджлівых дзён зноў выглянула сонейка. Парталы навін паведамлялі, што ў першыя сонечныя выхадныя пасля чарады дажджоў у лясах каля буйных гарадоў... былі заторы! Але, мяркуючы па сацсетках і асартыменце на галоўным рынку краіны — Камароўцы, — грыбоў хапіла ўсім.**

І гэта не толькі лісічкі, што ўжо паспелі надакучыць (іх, дарэчы, таксама на рынках зараз дастаткова, у сярэднім 11 рублёў за кіло), а паўнаважкія буйныя баравікі, падбярозавікі, маслякі на засолку. Сыраежкі наогул аддаюць за дзясятку — двухлітровае вядзерца, але, калі пашукаць, можна знайсці нават за 5 рублёў за той жа або крыху меншы аб'ём. Дарэчы, аб «лясных аўтамабільных заторах», згаданых вышэй. Самы вялікі адбыўся 9 жніўня пад Бабруйскам (за кадрам відэа голас паведамляе «Дуброўка, 6 раніцы»). Штогадовая сезонная «грыбная ліхаманка» сёлета накрыла практычна ўсе рэгіёны: пасля некалькіх «негрыбных» гадоў, калі лес неахвотна дзяліўся з людзьмі сваімі дарамі, гэтым летам ён расшчодрыўся. Мяркуючы па відэа ў сеціве, грыбы з лесу ўдачлівыя аматары ціхага палявання вывозяць поўнымі багажнікамі, а асабліва ўдачлівыя — нават прычэпамі (не верыце — зайдзіце на сайты мясцовых выданняў). Але так не ўсюды. Некаторыя пішуць: маўляў, амаль нічога не знайшлі. Больш удачлівыя ім адказваюць: значыць, дрэнна шукалі. Карацей, месцы трэба ведаць.

СТАР. 4

Мясцовы час

# ТЭРЫТОРЫЯ ГАСЦІННАСЦІ І ДОБРАСУСЕДСТВА

## Чым жыве прыгранічны Воранаўскі раён

**Для чалавека неабходна стварыць годныя ўмовы працы і сапраўдны дабрабыт у жыцці, лічыць старшыня Воранаўскага раённага выканаўчага камітэта Дзмітрый ЗАХАРЧУК. Тады ён не стане шукаць шчасце ў далечыні ад роднай зямлі. Будзе добрасумленна працаваць на ёй і будзе яе сапраўдным патрыётам.**

***— Дзмітрый Іванавіч, Воранаўскі раён прыгранічны. На яго тэрыторыі жывуць людзі розных нацыянальнасцяў. Як складваюцца адносіны паміж імі, як паўплывалі на гэта апошнія падзеі ў Еўрасаюзе?***

— Воранаўскі раён у гэтым сэнсе, можна сказаць, унікальны. Больш за 80 % яго насельніцтва складаюць палякі, 15 % — беларусы, 3 % — рускія, 1,5 % — літоўцы і столькі ж — прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. Што датычыцца веравызнання, то пераважае, безумоўна, каталіцкае. На тэрыторыі раёна знаходзіцца 13 касцёлаў, у тым ліку з двухсотгадовай гісторыяй. У адным з іх гучыць дзеючы арган, ёсць магчымасць ажывіць арганы ў некаторых іншых каталіцкіх храмах. Праваслаўных цэркваў у раёне налічваецца тры.

Хачу адзначыць, што канфесіі жывуць дружна, нават царкоўныя святы прыхаджане адзначаюць разам. Ды і мы — прадстаўнікі органаў улады — знаходзім са святарамі поўнае паразуменне.

Не будзем забываць, што ў Воранаўскага раёна самая вялікая працягласць граніцы з Літвой. І нацыянальныя, і культурныя асаблівасці тут, што называецца, «змазваюцца». У свой час, калі існаваў Савецкі Саюз, некаторыя жыхары Воранаўскага раёна ездзілі на работу ў Вільнюс, тут усяго каля 50 кіламетраў. Літоўцы таксама часта наведваліся да нас. Гэта па-першае.

Па-другое, роднасныя сувязі. Некаторыя воранаўцы асядалі ў Літве ў савецкі час, а іх родныя засталіся на тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым хачу прывесці цікавы прыклад. У час ковідных абмежаванняў я звяртаў увагу на стан некаторых вясковых хат і прысядзібных участкаў. Не выконваўся дробны рамонт, не выкошвалася трава, не было догляду магіл. Проста дзеці пажылых грамадзян, якія жылі і працавалі ў Літве, не маглі наведаць сваіх бацькоў і дапамагчы ім па гаспадарцы. Да нас у райвыканкам звярталіся жыхары Літвы з пытаннем, ці можна ў камунальнай службе замовіць паслугу, каб навесці ў сваякоў парадак. Раённае прадпрыемства ЖКГ такія паслугі за адпаведную плату выконвала.

Калі граніцу адкрылі, усе падобныя праблемы вырашыліся, і жыхары Літвы змаглі наведваць беларускіх сваякоў. Увядзенне бязвізу — вельмі своечасовы і правільны крок з боку ўлад нашай краіны. Бо суседзей, як казаў кіраўнік дзяржавы, не выбіраюць, яны нам дадзены Богам. З імі неабходна сябраваць. І літоўцы пасля таго да нас зноў паехалі.

Няхай адрозніваецца ідэалогія, некаторыя нацыянальныя каштоўнасці, але сувязі паміж людзьмі застаюцца, і на гэта немагчыма паўплываць. Нават літоўская моладзь, з якой актыўна працуе заходняя прапаганда, убачыўшы нашу сучасную беларускую рэальнасць, ад здзіўлення «адкрывае рот». Чысціня, утульнасць, спакой, актыўнае будаўніцтва, багацце на прылаўках, ветлівасць беларусаў не могуць іх не здзіўляць. Дома ім малявалі зусім іншую карціну.

Дарэчы, для замежных гасцей Воранаўскага раёна мы сумесна з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам



імя Янкі Купалы распрацавалі некалькі арыгінальных турыстычных маршрутаў па воранаўскай зямлі: аграсядзібы, касцёлы. Адкрылі ў Воранаве інфармацыйна-турыстычны цэнтр. Сумесна з Лідскім раёнам распрацоўваем праграму так званага прамысловага турызму. Планы ёсць, у недалёкай будучыні іх неабходна ажыццявіць.

***— Адной з галоўных задач органаў мясцовай улады з'яўляецца павышэнне якасці жыцця людзей. А гэта немагчыма зрабіць без развіцця сацыяльнай інфраструктуры. Як у Воранаўскім раёне ідзе работа ў дадзеным кірунку?***

— Адной з галоўных праблем, з якой давялося сутыкнуцца калі я ўзначаліў Воранаўскі райвыканкам, была праблема кадраў. Многія з маладых спецыялістаў, адпрацаваўшы пэўны тэрмін, пакідалі раён. Нават выпускнікі школ пасля заканчэння вучобы імкнуліся асесці ў буйных гарадах — Мінску і Гродне.

Праблему пачалі вырашаць з жылля. Пачынаючы з мінулага года сталі выдзяляць для маладых спецыялістаў арэнднае жыллё. Цалкам добраўпарадкаваныя кватэры — толькі мэблю сваю занось. У мінулым годзе выдзелілі шэсць падобных кватэр для бюджэтнікаў. Прычым улічваўся склад сям'і. Адзін чалавек — аднапакаёвая, сямейная пара — двухпакаёвая, калі ёсць дзеці — трохпакаёвая.

Летась пачалі будаваць 40-кватэрны дом, дзе бюджэтнікам будзе выдзелена ўжо 29 кватэр. Такім чынам, аб'ём арэнднага жылля мы павялічылі ў чатыры разы. І гэта дало станоўчы вынік — напрыклад, па медыцыне мы замацавалі 100 % маладых спецыялістаў.

Для таго каб кадры заставаліся на месцы, мы пачалі шчыльна працаваць з мэтавымі дагаворамі. Напрыклад, захацеў малады чалавек вывучыцца на ветэрынарнага ўрача, паступіў у акадэмію — гаспадарка выплачвае яму стыпендыю ў памеры 20 базавых велічынь. Згадзіцеся, добры стымул! І ён ведае, што на радзіме яго чакаюць. А яшчэ малады чалавек павінен ведаць, што пасля заканчэння вучобы ў ВНУ ў вёсцы яго чакаюць добраўпарадкаваны дом, сур'ёзны заробак, а хутка з'явіцца і аўтамабіль.

Рабоце з маладымі спецыялістамі мы ўдзяляем вялікую ўвагу. Кожны год адбываецца мая з імі сустрэча, дзе абмяркоўваюцца праблемныя пытанні. Для іх арганізоўваюцца культурна-забаўляльныя мерапрыемствы, экскурсіі ў працоўных калектывах, прычым не толькі па Беларусі, але і ў Расійскую Федэрацыю, практыкуем туры выхаднога дня ў санаторыі.

Ідзе работа і ў галіне аховы здароўя. У мінулым годзе ў райцэнтры было адкрыта новае стаматалагічнае аддзяленне. Выдзелены сродкі на рэканструкцыю галоўнага корпуса цэнтральнай раённай бальніцы, ідзе абнаўленне спецыяльнага транспарту і абсталявання, зусім нядаўна закуплены новы мабільны ФАП. Бо Воранаўскі раён — гэта 337 населеных пунктаў, 1640 хутароў, 900 кіламетраў толькі мясцовых дарог і 104 кіламетры рэспубліканскіх.

Ёсць змены і ў галіне адукацыі. Напрыклад, у мінулым годзе быў заключаны дагавор з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы, які прадугледжвае павышэнне прафесійнага майстэрства сярод настаўнікаў школ, што забяспечваюць выкладчыкі ўніверсітэта.

Сярод вучняў пашыраецца алімпіядны рух. Літаральна на працягу года мы павялічылі колькасць пераможцаў і прызёраў школьных алімпіяд. Ёсць дасягненні сярод вучняў у IT-сферы. Нашы дзеці рэгулярна наведваюць IT-лабараторыю пры ўніверсітэце і Парк высокіх тэхналогій у Мінску. Далучаем дзяцей да навукова-даследчай і культурна-выхаваўчай дзейнасці. Як вынік гэтых намаганняў — 25 % выпускнікоў воранаўскіх школ сталі студэнтамі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Ствараем у Воранаве клас кітайскай мовы.

Вялікая ўвага ў раёне — спартыўнаму руху. Наш гонар — прызёры Алімпійскіх гульняў — ураджэнцы Воранаўскага раёна. У 2021 годзе быў рэалізаваны сумесны праект з РУП «Белмытсэрвіс» па стварэнні залы цяжкай атлетыкі. Працуюць дзве залы па ўсходніх адзінаборствах, стварылі шматфункцыянальную спартыўную пляцоўку для камандных відаў спорту. Цяпер прыступаем да стварэння ў раёне сучаснага фітнес-цэнтра. Ёсць умовы для заняткаў тэнісам. Не хапае магчымасцяў толькі для водных відаў спорту. Астатняя — калі ласка!

Паступова ў раёне развіваюцца сферы гандлю і паслуг, што дае магчымасць ствараць новыя рабочыя месцы.

Што датычыцца росту заработнай платы, то ён летась быў на ўзроўні больш за 130 %.

Годная зарплата, добрыя ўмовы жыцця, якасная вулічна-дарожная сетка — усё гэта складнікі таго, што чалавек не пакіне свой родны кут і застанецца тут назаўсёды.

***— Аснова эканомікі Воранаўскага раёна — сельская гаспадарка. З якімі вынікамі, на ваш погляд, падыдуць працаўнікі на фініш уборачнай кампаніі?***

— Адразу хачу адзначыць, што ў нас у раёне ёсць і свая прамысловасць. Я маю на ўвазе мясцовую «Сельгастэхніку». Гэта, можна сказаць, невялікі завод, на якім працуе прыкладна 100 чалавек. Там вырабляюцца прычэпы і паўпрычэпы, гноераскідальнікі, адаптары, каляскі.

У параўнанні з мінулым годам, калі ўраджайнасць збожжавых культур у нас склала 50,5 ц/га, сёлета вынік будзе больш сціплы. Адбіліся ўмовы надвор'я. Пацярпеў яравы ячмень. Разлічваем на 44 ц/га. Але сёлета мы чакаем гістарычны для раёна рэкорд па ўраджайнасці рапсу. Яна складае 43 ц/га, а ў мінулым годзе было 38,6 ц/га.

Падрыхтоўка да ўборачнай была праведзена своечасова і ў неабходных аб'ёмах: падрыхтавалі тэхніку, укамплектавалі экіпажы, стварылі запас паліва. Для сельскагаспадарчых арганізацый прадугледзелі так званыя фінансавыя «падушкі». Ну, а галоўнае — надалі людзям сапраўдны баявы настрой, з якім яны паспяхова працавалі ўвесь час кампаніі.

Два гады запар мы першыя заканчвалі ўборку ў Гродзенскай вобласці, дапамагалі суседзям. Скажу шчыра, у нас, у Воранаўскім раёне, не прынята весці «бітву за ўраджай». У нас ідзе планавая камандная работа. Добрая падрыхтоўка складае 70 % поспеху.

**Сяргей РУЧАНАЎ,**
**фота аўтара.**

---

Па сутнасці



# У пачатку шляху

Згадайце першае спатканне. Знаёмства. Хваляванне. Сэрца б'ецца, уяўленне малюе аптымістычныя карцінкі. Як пішуць літаратары, дзесьці казыча ў душы... Але першае спатканне бывае не толькі з чалавекам. З працай, напрыклад. Мне здаецца, гэта гістарычны момант для кожнага чалавека. Станаўленне на крыло. Стаіш на скрыжаванні, а наперадзе — вялікі гасцінец. З аднаго боку — хвалююча, нават цяжка, з іншага — адчуваеш сябе Калумбам, адкрываеш сваю асабістую Амерыку. Чысцюсенькія лісты не толькі працоўнай кніжкі. Твая працоўная біяграфія — tabula rasa. Калі ўсё яшчэ наперадзе. І мо не трэба спяшацца запаўняць — абы запоўніць — старонкі ў працоўным сшытку. Каб было як мага меней клякс і выпраўленняў. Гэта не пра маралізатарства, гэта каб зберагчы юныя душы. Як пісаў класік: «Прайсці яшчэ раз, азірнуцца, // Сабраць з дарог каменні тыя, // Што губяць сілы маладыя, — // К вясне б маёй хацеў вярнуцца»...

Усе ведаюць і радкі гэтыя, і тое, што так адбываецца. І усе наступаюць на тыя ж граблі. Маладзі жадаю як менш набіць гузоў і каб іх працоўны летапіс ад пачатку быў напісаны акуратным почыркам. Гэта залежыць і ад маладога спецыяліста, і ад калектыву. Цяпер трэндава ўспамінаць свой вопыт, як кажуць, гісторыю поспеху. Гэта так гучыць на заходні манер, а я б назваў гэта гісторыяй сталення. Бо працоўная дарога не заўжды будзе выклікаць галівудскую ўсмешку.

Пра свой досвед. Першыя спробы пяра (яшчэ ў школе) для мяне пачалася з малой радзімы — мясцовай раёнкі. А вось прафесійная журналістыка для мяне пачалася ў Кобрыне. Рэдакцыю з першымі (здавалася тады — геніяльнымі) артыкуламі прыходзілася штурмаваць, нібы некалі захопнікам сімвал майго роднага горада — Камянецкую вежу. Пашанцавала на кіраўніка — і потым сустракаліся добрыя людзі, але менавіта за Валянціна Паўлавіча ад сэрца стаўлю свечкі ў нашых бажніцах. Ён паверыў у «неапёранага журналіста». Канешне, сярод «акул пяра» хапала і бурчлівых кабет. Але «з брыдкім качанём» няўрымслівa працавала галоўны рэдактар. Кожны раз пры сустрэчы і сёння хочацца сказаць ёй: «Дзякуй, Наталля Станіславаўна»... Таму сёння я сам вельмі адказна і цярпліва стаўлюся да стасункаў з эшалонамі маладых спецыялістаў. «Акул пяра» ў медыйным акварыуме хапае і без мяне.

Але, што называецца, працоўная адаптацыя — гэта шлях з двухбаковым рухам. Хацелася б імпэту і ад тых, хто павінен стаць лепшым за нас. Адразу адзначу — то не тэндэнцыя, але факты ёсць, калі гэтага руху насустрач ну ніяк не назіраецца.

Прыкмета часу — забавы моладзі. Дык сёння некаторыя маладыя спецыялісты ўзялі за моду флэшмоб: што не падабаецца на першым месцы працы. Такі вось квэст: нібы хто болей знойдзе хібаў і заган, той пераможа. І блогерскую прастору насычаюць заявамі, антылайкамі — хто на што здольны, а яна, прастора, усё сцерпіць. Нават калі «праблема глабальнага маштабу», ні больш ні менш — кулера ў кабінеце няма. І як пасля гэтага жыць? (Калі хто з маладых не зразумеў — гэта я так іранізую...) Нашы бацькі наадварот у такім узросце цягнуліся да цяжкасцяў. Ехалі «па туман і пах тайгі». Ніхто не зважаў на побытавыя цяжкасці. Моладзь была апантаная вялікімі ідэямі — будаўніцтвам магістраляў, заводаў, плацін, настаўніцтвам або ўрачэбнай практыкай у глыбінцы.

Цяпер, скажаце, час не той? Прабачце. Сёння, як і заўжды, гучыць з папрокам: «Замінаюць маладому пакаленню»... Дык у чым справа? Вось вам магчымасці. Прапаноўвайцеся, нястрымна рвіцеся наперад, стаўце рэкорды. А вось чакаць таго, што атрымаеце «цёплае месца» і адразу заробкі, як у тых, хто ў прафесіі ўжо не першае дзесяцігоддзе, не варта. Нездарма ж кар'ерная і прафесійная — «лесвіца», а не «пад'ёмнік». Трэба прыкладаць намаганні. Кропкі адрыву ёсць — паверце. Больш удалыя і надзейныя, чым у тых, хто ўваходзіў у дарослае жыццё ў 90-я або нават яшчэ гадоў дзесяць таму.

Яшчэ вельмі важкая акалічнасць — стаўленне да сваёго. Нельга цурацца сваёй малой Радзімы, драўлянай Хаты, мазалёў на руках Маці. Нельга адмаўляцца быць часткай гэтага галоўнага ў жыцці. Мультыкультурная прастора, глабалізацыйны парадак падштурхоўвае да забыцця і адрачэння ад каштоўнасцяў народа, навязвае думку: маўляў, сваё аўтэнтычнае — перыферыйна, заакіянскаму аддай сваё сэрца. Памылка. Жахлівая памылка. Сваё трэба любіць, не за тое, што яно блішчыць, а за тое, што — сваё. І калі школа ці нават ВНУ не змаглі навучыць адданасці справе, калектыву, Радзіме, то гэтыя хібы будуць выпраўляць на працы. І маладому спецыялісту трэба разумець: не ў адзін момант будзе свая ўласная кватэра. Пачакайце. Папрацуйце. Трэба ж унесці і свой уклад у развіццё працоўнага месца, ад якога чакаеце салодкіх «данатаў».

А яшчэ трэба памятаць, што вада са свайго калодзежа смачнейшая. Галоўнае не пляваць у яго. І тады наперадзе — шырокія праспекты, зялёнае святло і нават чырвоная дывановая дарожка. Добра адзначана — моладзь на маршы. Дык ужо не кульгайце, не псуйце той строй.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ЗАМЕСТ ГАМБУРГЕРА — ГАРАЧЫ БУТЭРБРОД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спецыяліст нагадала, што ў мінулым навучальным годзе ў 23 школах Беларусі праходзіў пілотны праект па апрабацыі новых тэхналогій прыгатавання ежы. Удзельнічалі 17 гарадскіх школ і гімназій і шэсць школ у сельскай мясцовасці. Эксперымент прызнаны паспяховым. Таму да канца лета вядзецца падрыхтоўка персаналу школьных сталовых і апрабаваны спосаб харчавання будзе прымяняцца ў частцы школ — з 1 верасня 2023 года, у частцы — з 1 студзеня 2024 года, у астатніх — з 1 верасня 2024 года.

Асноўныя змены датычацца ўкаранення новых страў і вырабаў. Пры іх прыгатаванні будуць кіравацца новым зборнікам, складзеным з улікам смакавых пераваг школьнікаў. Ён уключае каля 400 страў, якія можна прыгатаваць і дома. Зборнік з новай рэцэптурай размешчаны на сайтах Міністэрства адукацыі, абласных упраўленняў па адукацыі, школ.

Галоўнымі высновамі пасля правядзення эксперымента падзялілася **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Міністэрства аховы здароўя Ала МАЛАХАВА.**

— Гадамі школьнае харчаванне гатавалася на аснове зборніка рэцэптур. І няхай там быў дастаткова пералік страў, але выбіраліся пераважна простыя ў выкананні, а складаных пазбягалі. Так, няпроста прыгатаваць дранікі, бабку ці складаную салату. Такім і быў рацыён: што больш простае і бяспечнае. Але смакавыя перавагі мяняюцца і ў дарослых, і ў дзяцей, з'яўляюцца новыя прадукты. І гэтаму павінна адпавядаць сённяшняе харчаванне ў школах.

## ПІЦА Ў МЕНЮ ДАПУСКАЕЦЦА, ШАЎРМА — НЕ

Ала Малахава адзначыла, што з пачатку эксперымента ў прэсе з'явіліся крытычныя матэрыялы, маўляў, цяпер дзеці будуць есці фастфуд і ў школе.

— Так, былі ў эксперыментальным меню гамбургеры, чызбургеры, але цяпер яны выключаны. Будзе штосьці падобнае, што будзе прынцыпаў мець назву, скажам, гарачы бутэрброд. Бо адзін з прынцыпаў — выхаванне здаровага харчавання ў школьнікаў.

Пры гэтым спецыяліст адзначыла, што нічога дрэннага не здарыцца, калі раз на два тыдні школьнік з'есць піцу.

— Мы не забараняем піцу, раз на два тыдні яе можна ўключыць, — падкрэсліла Ала Малахава, дадаўшы, што не ўсе стравы, напрыклад, тую ж шаўрму, уводзіць у меню школьніка бяспечна. Аднак выбар вялікі.

— На месяцах тэхнолагамі распрацавана больш за 400 рэцэптаў. Яны былі прадстаўлены нам, і мы разглядзелі і адобрылі іх не толькі з пазіцый складанасці прыгатавання, але і з пазіцыі дзіцячай дыетэтыкі.

Пры гэтым, нягледзячы на тое што рацыён распрацаваны на паўгода, увесь час у меню будуць з'яўляцца новыя стравы.

— Калі дзеці не ядуць нейкую страву — варта яе мяняць своечасова. Нельга, каб прадукты выкідваліся, бо гэта і дзяржаўныя, і бацькоўскія грошы. Варта імкнуцца да таго, каб не больш за 10 % ежы адпраўлялася ў адходы, — адзначыла Ала Малахава.

Спецыяліст адзначыла, што падчас эксперыменту былі выяўлены і адмоўныя бакі. У прыватнасці, карміць усіх школьнікаў цягам дзвюх гадзін. Ад такога падыходу вырашана адмовіцца. Аптымальна, калі вучні 1—4 класаў будуць атрымліваць гарачы сняданак, вучні 5—11 класаў — гарачы абед.

— Такім чынам ежа будзе гатавацца паслядоўна і можна пазбегнуць скучанасці ў сталовай, — патлумачыла Ала Малахава.

## ЦІ З'ЯВІЦЦА Ў ШКОЛАХ ШВЕДСКІ СТОЛ?

У рамках пілотнага праекта ў некаторых сталічных школах быў апрабаваны шведскі стол.

— Мы прапаноўвалі абед на выбар, прычым не толькі старэйшым школьнікам, але і вучням 1—4 класаў. Дзеці рабілі выбар з двух варыянтаў. Мы атрымалі цікавы вопыт. Добра, калі ўлічваюцца пажаданні, бо ва ўсіх свае сямейныя традыцыі і смакавыя перавагі, — расказвае **дырэктар Камбіната школьнага харчавання горада Мінска Надзея ЛУКАШЭВІЧ**. — Дапоўнілі і сталовыя прыборы, дадалі нажы, школьнікі з задавальненнем імі карыстаюцца. Для гарачых напояў мы прапанавалі цукар дадаваць асобна. Гэта вельмі віталася бацькамі. З'явілася новая форма шклянак — гладкая. Абедзенная зала школьнай сталовай усё больш нагадвае кавярню ці рэстаран — гэта таксама прываблівае.

Ёсць цікавы вопыт заказнога меню і ў рэгіёнах.

— У цэлым арганізаваць меню на выбар складана, але можна прапаноўваць асобныя стравы ці прадукты. Некаторыя дзеці, напрыклад, не п'юць малако, і іх не прымусіш. Навошта яго выліваць? Таму можна хоць бы тут даваць выбар. У Магілёўскай вобласці ў некаторых школах прапаноўвалі тры салаты на выбар — і яны з'ядаліся. Мы заўважылі, што дзеці прыносяць з сабой соусы і імі паліваюць мяса, катлету ці рыбу. Чаму не прапаноўваць на выбар соусы? У тым, каб стравы падабаліся школьнікам і іх з'ядалі, мусіць быць зацікаўлена і школа, і камбінаты школьнага харчавання, — рэзюмавала Ала Малахава.

## ДЫЕТЫЧНЫЯ КАЎБАСЫ І КАРЫСНАЕ ПЕЧЫВА

У Беларусі распрацоўваюцца малочныя, мясныя, хлебныя, кандытарскія і кансерваваныя прадукты для харчавання школьнікаў, якія паступаюць не толькі ў школьныя сталовыя і буфеты, але і ў прадуктовыя крамы. Напрыклад, печыва, сушкі і саломка для школьнікаў з нізкім утрыманнем солі і цукру, якія абагачаюцца кальцыем і вітамінамі групы B. Сёлета ў навукова-практычным цэнтры Нацыянальнай акадэміі навук па харчаванні завяршаецца распрацоўка сухіх сняданкаў, у тым ліку з нізкім утрыманнем глютэну, а таксама цукру і солі. Тое ж датычыцца дзіцячых кансерваваных прадуктаў і сокаў.

— Да эксперыменту па ўдасканаленні школьнага харчавання намі падрыхтаваны цэлы пералік, які налічвае 54 групы прадукцыі. Уся яна запатрабавана ў Беларусі, валодае вялікім экспартным патэнцыялам і пастаўляецца за мяжу, — адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Дзмітрый ЗАЙЧАНКА**.

Каля 30 найменняў малочнай і мясной прадукцыі распрацавана для харчавання дзяцей у інстытуце мясамалочнай прамысловасці Нацыянальнай акадэміі навук. У прыватнасці, каўбасныя вырабы для дзяцей з павышаным індэксам масы цела. Такія каўбасы ўтрымліваюць на 30 % менш тлушчаў, таксама ў іх істотна менш солі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Расія прапрацоўвае з партнёрамі альтэрнатывы збожжавай здзелкі

Пра гэта заявіў пасол Расійскай Федэрацыі ў Турцыі Аляксей Ярхоў, паведамляе ТАСС са спасылкай на агенцтва ІНА.



«Чарнаморская ініцыятыва — зусім не панацэя для задавальнення патрэб афрыканскіх і іншых краін у прадуктах харчавання, — сказаў Ярхоў. — Альтэрнатывы маюцца, і яны актыўна прапрацоўваюцца ў кантактах з нашымі партнёрамі».

Паводле яго слоў, гаварыць аб аднаўленні збожжавай здзелкі можна будзе толькі пасля выканання патрабаванняў Расіі. Пасол нагадаў, што Расія патрабуе бесперашкодны доступ сваёй сельгаспрадукцыі і ўгнаенняў на сусветны рынак. Толькі ў такім выпадку, па яго словах, магчыма будзе гаварыць аб аднаўленні Чарнаморскай ініцыятывы. Дыпламат таксама звярнуў увагу на «каласальны ўклад» расійскага боку ў забеспячэнне глабальнай харчовай бяспекі. Ярхоў дадаў, што Расія «заўсёды гатова да стасункаў з турэцкімі партнёрамі, у тым ліку па гэтым пытанні». Пасол адзначыў, што «доля Украіны на сусветным рынку пшаніцы — не больш за 5 працэнтаў, тады як Расіі — 20 працэнтаў».

З 18 ліпеня Расія спыніла дзеянне збожжавай здзелкі, паколькі абавязацельствы здзелкі ў адносінах да РФ так і не былі выкананы.

## Кабмін ФРГ ухваліў законапраект аб легалізацыі канабісу

Дакумент прадугледжвае дазвол жыхарам Германіі, старэйшым за 18 гадоў, захоўваць да 25 грамаў марыхуаны і вырошчваць максімум тры канабісы ў хатніх умовах для асабістага ўжывання. Гэтую расліну выключаць са спіса забароненых рэчываў. Як перадае агенцтва DPA, дакумент павінен быць разгледжаны і прыняты Бундэстагам (парламентам) — ухвалы Бундэсрата (палаты федэральных земляў), як паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя, не патрабуецца. Чакаецца, што закон уступіць у сілу у канцы года.

Легалізацыя наркотыку ў Германіі прадугледжана кааліцыйным пагадненнем 2021 года. Канцлер Германіі Олаф Шольц у жніўні 2022 года заявіў аб тым, што яму было складзена пагадзіцца з падобнай ідэяй падчас кааліцыйных перагавораў. Аднак партнёры па кіруючай кааліцыі сцвярджаюць, што легалізацыя марыхуаны дасць магчымасць паспяхова змагацца з незаконным абаротам наркатычных рэчываў і будзе садзейнічаць кантролю за якасцю дазволеных прэпаратаў.

Міжнародны вектар

# ПАРТНЁРСТВА, ЗАСНАВАНАЕ НА СЯБРОЎСТВЕ І ЎЗАЕМНАЙ ПАВАЗЕ

## У Мінску адбылася сустрэча міністраў абароны Беларусі і Кітая

**Член Цэнтральнага ваеннага савета, Дзяржсавета, кіраўнік абароннага ведамства КНР Лі ШАНФУ наведвае Беларусь з афіцыйным візітам з 16 да 18 жніўня. Падчас першага перагаворнага дня, які адбыўся ў Цэнтральным доме афіцэраў, кіраўнік абароннага ведамства нашай краіны Віктар ХРЭНІН прывітаў прадстаўнічую дэлегацыю Народна-вызваленчай арміі Кітая на гасціннай беларускай зямлі.**



Віктар Хрэнін падкрэсліў, што супрацоўніцтва з Кітаем з'яўляецца адным з найважнейшых прыярытэтаў беларускай знешняй палітыкі. Па яго словах, Кітай — сяброўская нам дзяржава, якая мае важную ролю ў сусветнай палітыцы і ўмацоўвае свой аўтарытэт і ўплыў на міжнароднай арэне. «За 31 год дыпламатычных адносін нашы краіны выйшлі на беспрэцэдэнтна высокі ўзровень супрацоўніцтва, — падкрэсліў кіраўнік абароннага ведамства Беларусі. — Мы дасягнулі ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства на падмурку традыцыйнага сяброўства і ўзаемнай павагі. Блізкія сяброўскія адносіны паміж кіраўнікамі нашых краін Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам і Сі Цзіньпінам, падабенства пазіцый па асноўных пытаннях міжнароднага парадку дня з'яўляюцца асновай для развіцця супрацоўніцтва ва ўсіх сферах дзейнасці». Ва ўмовах абстаноўкі ў свеце, якая мяняецца, але захоўвае свой крызісны характар, па перакананні Віктара Хрэніна, беларуска-кітайскія адносіны могуць стаць прыкладам для многіх краін. «Нягледзячы на знешнія фактары, усепагодны характар адносін дазваляе рухацца да стварэння супольнасці агульных інтарэсаў і адзінага лёсу, — паведаміў міністр абароны Беларусі. — Гэтыя інтарэсы, безумоўна, ахопліваюць асноўныя сферы жыццядзейнасці нашых дзяржаў. Сёння разам з выдатнымі перспектывамі развіцця адносін у гандлёва-эканамічнай і навукова-тэхнічнай галінах у нас ёсць магчымасць і жаданне пашыраць двухбаковае ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва», — падкрэсліў ён. Міністр абароны Беларусі перакананы, што візіт у нашу краіну яго кітайскага калегі будзе садзейнічаць умацаванню партнёрскіх адносін, сяброўства і ўзаемапаразумення паміж Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь і Народна-вызваленчай арміяй Кітая.

«У апошнія гады пад стратэгічным кіраўніцтвам Сі Цзіньпіна і Аляксандра Лукашэнкі кітайска-беларускае ўсебаковае супрацоўніцтва бесперапынна ўмацоўваецца, нашы двухбаковыя адносіны няўхільна развіваюцца, — падкрэсліў у сваю чаргу міністр абароны КНР. — У мінулым годзе мы атрымалі новы статус нашых двухбаковых адносін — усепагоднае, усеабдымнае партнёрства. Гэта сведчыць, што нашы адносіны атрымалі гістарычны скачок, і цяпер мы з вамі па-сапраўднаму жалезныя браты».

Актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва ў розных сферах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць, будуць абмяркоўвацца падчас іншых дзён афіцыйнага візіту. Плануецца, што Лі Шанфу разам са сваёй дэлегацыяй наведае шэраг аб'ектаў Узброеных Сіл нашай краіны.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

**Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выказвае глыбокія спачуванні начальніку галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Сазонавай Вользе Уладзіміраўне ў сувязі са смерцю БАЦЬКІ. Страчваючы сваіх блізкіх, мы губляем частку сябе. Гэта душэўны боль, супраць якога няма лекаў. Няхай нашы словы спагады падтрымаюць Вас у гэтыя цяжкія дні і дапамогуць перажыць гора страты. Шчыра смуткуем разам з Вамі.**

# ХТО Ў ЛЕС, ХТО ПА ГРЫБЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ адна штогадовая грыбная тэма для абмеркавання — вялізныя баравікі. У гэтым годзе аб такіх пакуль не паведамлялася. У мінулым кілаграмовы баравік быў знойдзены непасрэдна пад Мінскам, літаральна за кальцавой: відэа ўдачлівага грыбніка набрала мільёны праглядаў, пасля чаго шчаслівец парадаваў гледачоў яшчэ і відэа батарэі слоікаў закатак з аднаго-адзінага грыба. Хоць наогул медыкі папярэджваюць, што перарослыя грыбы наогул не карысныя для здароўя, імі лепш проста любавацца, а ў каструлю ці на патэльню адпраўляць невялікія і маладыя. Але пра тое, як не атруціцца грыбамі, пагаворым ніжэй. А цяпер адпраўляемся ў самае грыбное месца гарадскіх джунгляў — на рынак.

## ЯК НА ПАДБОР

Сёлета ў выхадны дзень грыбы атакуюць пакупнікоў ужо на подступах да Камароўкі. Святлана, пажылая інтэлігентнага віду дама, прывезла свае грыбочкі ў Мінск з-пад таго самага Бабруйска, дзе якраз і былі вышэйзгаданыя лясныя заторы. Баравікі ў вядзерцы такія прыгожыя, што здаюцца нават нейкімі бутафорскімі — буйныя, чыстыя, як на падбор. Зрэшты, аб іх сапраўднасці сведчыць смачны лясны пах з вядзерца. Але прыдзірлівая пакупніца выказвае недавер: хоча паглядзець, што там унізе вядзерца. Прадавец не пярэчыць, бо і кошт немаленькі — 80 рублёў просіць Святлана за тры літры «белых». На самім рынку кошты на «царскія грыбы» яшчэ вышэйшыя — 50 рублёў маленькае (літровае) вядзерца, 35 просяць за паўлітровую тару. Але пакупнікі знаходзяцца, бо баравікі заўсёды дарагія, нават калі прапанова вялікая, як сёлета. Падбярозавікі таннейшыя: маленькае вядзерца можна купіць за 25, а калі пашукаць, то нават за 15 рублёў, рыжыкі прадаюць у сярэднім па 15 за той жа аб'ём, падасінавікі — 20—35, маслякі — за 10—15 рублёў за вядзерца.

«Масляты — на засолку», тлумачыць усмешлівая дзяўчына на радах, дзе гандлююць прыватнікі. І тут жа дзеліцца рэкамендацыямі.

— У маслят даводзіцца чысціць верхнюю ліпкую плёнку, гэта вельмі марудна і доўга. Я пазбаўляюся ад слізі, якая пераходзіць у марынад, па-іншаму: проста некалькі разоў вару грыбы. Павару хвілін дзесяць, зліваю ваду праз друшляк, наліваю чыстую і зноў вару ў ёй маслякі. Другая вада будзе ўжо не такой кіселепадобнай, а трэцяя — яшчэ больш празрыстай. А марынадаў існуе вельмі шмат. Мне падабаецца з лімоннай кіслатой замест воцату, а лішнюю кіслінку можна прыглушыць цукрам.

І абавязкова трэба пакаштаваць марынад перад тым, як апускаць туды грыбы, — смачна вам ці не? Гэта дае магчымасць скарэкціраваць смак, і закатка атрымаецца — пальчыкі абліжаш, дадае суразмоўніца.

## МЯСЦОВЫ ПРАДУКТ

Летась грыбы прыязджалі ў сталіцу здалёк — спачатку з Брэстчыны, потым з Віцебшчыны. Цяпер іх шлях на прылаўкі стаў значна карацейшы, у асноўным на Камароўцы прадстаўлены мясцовы прадукт, які вырас у радыусе 100 кіламетраў (плюс-мінус). І такая сітуацыя на рынках усіх буйных гарадоў: у лясах грыбоў дастаткова шмат, везці іх здалёк няма сэнсу.

Дарэчы, выбіраць лясныя грыбы прадаўцы рэкамендуюць менавіта нюхам, а потым ужо зрокам і навобмацак. Панюхайце грыбочкі — яны павінны пахнуць так, каб вам захацелася іх прыгатаваць. Ну і, вядома, навобмацак яны павінны быць шчыльнымі і пругкімі, а вонкава — прыгожымі.

Прапанова досыць вялікая, але попыт яна нельга сказаць што перавышае: грыбы відавочна выклікаюць пакупніцкую цікавасць. Сезоннасць і эксклюзіўнасць лясных грыбоў працуюць лепш за любыя маркетынгавыя выкруты. Вешанкі і шампіньёны ў продажы — круглы год. Але нават дарагія шампіньёны з крэмава-карычневым капялюшыкам, якія маскіруюцца пад баравікі,



маюць «пластыкавы» смак і амаль не пасуць нюх грыбным пахам. А вось дзікія, духмяныя лясныя грыбы паесці свежымі і нарыхтаваць на зіму можна толькі цяпер, і сезон кароткі. Хоць сёлета ён абяцае быць даўжэйшым за звычайны — пачаўся ж крыху раней і за кошт гэтага працягнецца даўжэй.

Грыбны асартымент Камароўкі — баравікі і падбярозавікі, маслякі, падасінавікі і рыжыкі. Так, яшчэ сыраежкі, калі хто любіць. Лісічкі, вядома, таксама, і іх шмат. Лічыцца, што ў лісічак два сезоны — летні і восеньскі (летнія святлейшыя і далікатнейшыя па смаку, восеньскія — буйнейшыя, валодаюць больш насычаным смакам і водарам). Але сёлета, здаецца, абодва гэтыя сезоны зліліся ў адзін доўгі. Лісічкі гаспадыні сёння ўжо бяруць не толькі паесці, але і на закаткі. А ў цэлым на гандлёвым месцы пад зялёнымі тэнтамі злева ад уваходу на адкрыты рынак, дзе разгарнуўся прыватны гандаль і стаіць смачны грыбны пах, людзі заходзяць не толькі купіць грыбоў, але і проста прыцаніцца і палюбавацца.

— Грыбы — самы кампанейскі прадукт, — павучае бадзёры мужчына гадоў пяцідзесяці маладую пакупніцу. — Насмажыць з бульбачкай — і можна ў добрай кампаніі да раніцы сядзець, асабліва калі дадаць на стол бутэлечку каньяку. Вось давайце я да вас у госці прыйду? З вядзерцам баравікоў! Або лісічак...

Дзяўчына смяецца і аднекваецца, прадаўшчыца незадаволена глядзіць на вясёлага мужчыну: пакупніца ўцякла да іншага прылаўка, хоць збіралася купіць грыбы тут. Зрэшты, дзядзечка купляе ў яе вядзерца лісічак, і яна глядзіць на яго ўжо не так сурова.

## КАРЫСЦЬ ЦІ ШКОДА?

А насамрэч, ці карысныя грыбы? Дыетолагі аб гэтым спрачаюцца, а медыкі нават ці чакаюць грыбнога сезона з радасцю. Бо кожны такі сезон прыносіць з сабой павелічэнне выклікаў «хуткай» і выпадкаў шпіталізацыі — а з харчовых атручванняў менавіта атручванне грыбамі лічыцца самым небяспечным. Але аб небяспеках пазней, пакуль — аб карысці і некарысці для здароўя ядомых і якасных лясных грыбоў.

Перш за ўсё склад іх макра-і мікраэлементаў напрамую звязаны са складам глебы таго месца, дзе яны раслі і былі сабраныя. Грыбы, як ніводны іншы прадукт, назапашваюць солі цяжкіх металаў і іншыя небяспечныя рэчывы. Таму нельга збіраць грыбы паблізу трас або ў экалагічна небяспечных раёнах. На буйных рынках пакупніку гарантуюць кантроль бяспекі грыбоў, якія там прадаюць, і ў прадаўца можна папытаць дакументы, якія пацвярджаюць гэта. Пры набыцці з рук на падыходах да рынку або ўздоўж аўтатрас такой гарантыі ніхто не дасць: даводзіцца спадзявацца толькі на разважлівасць, сумленнасць і кампетэнтнасць прадаўца.

Зрэшты, нават самыя якасныя грыбы гастраэнтэролагі кваліфікуюць як «цяжкую ежу» з-за багацця ў іх хіціну, што цяжка пераварваецца. Агульнавядома, што педыятры не рэкамендуюць уключаць грыбы ў рацыён маленькіх дзяцей, а ў еўрапейскіх краінах дактары не раяць песціць грыбнымі стравамі нават падлеткаў. Хаця ў нас бацькі так не лічаць.

— Мы заўсёды елі грыбы, і ўнукі мае іх вельмі любяць. Гэты любімы дзіцячы ласунак, — дзеліцца пенсіянерка, якая прыцэньваецца да баравікоў. — Я заўсёды купляю баравікі для малодшага ўнука, яму пяць, і ён ужо сапраўдны грыбнік. Ходзіць з дзядулем у грыбы ў лес, згодны ўставаць у пяць гадзін раніцы, адрознівае ядомыя грыбы ад неядомых.

Грыбы сапраўды любіць большасць дзяцей, і гэта — адзін са спосабаў накарміць малаежку: ад грыбнога духмянага супчыка або смажаных бульбачкі з грыбамі не адмовіцца нават самае пераборлівае дзіця. Сёння ў дыеталогіі існуе меркаванне, што дзеці інтуітыўна адчуваюць, што карысна для іх арганізма, а з узростам (фарміруючы харчовыя звычкі, у большасці некарысныя) сучасны чалавек гэтую здольнасць губляе. Дык вось, лясныя грыбы сапраўды валодаюць цэлым спектрам карысных для здароўя якасцяў. Напрыклад, высокім утрыманнем вітаміну D, аб недахопе якога ў нашых шыротах медыкі паўтараюць увесь час.

Няцяжка здагадацца, што больш за ўсё вітаміну D у элітных белых грыбах. А ў цэлым, у любых лясных грыбах шмат вітамінаў групы B ($B_2$ неабходны нервовай і рэпрадуктыўнай сістэмам, $B_3$ дадатна ўплывае на сардэчна-сасудзістую сістэму і змяншае ўзровень халестэрыну). Таксама яны ўмацоўваюць імунітэт і ўтрымліваюць прабіётыкі, якія дабратворна ўплываюць на рост карысных бактэрый у кішэчніку. А кішэчныя бактэрыі — свайго роду «завод» па вытворчасці найважнейшых для нашага арганізма рэчываў: напрыклад, тлустых кіслот або нейрагармонаў — пасрэднікаў перадачы нервовага імпульсу. Сучасныя даследаванні пацвярджаюць, што мікрабіём кішэчніка адыгрывае мноства ключавых роляў у бесперабойнай паўсядзённай рабоце нашага цела, і лясныя грыбы аздараўліваюць яго і наладжваюць яго правільнае функцыянаванне. Але, зразумела, пры ўмове, што грыбы гэтыя ядомыя, чыстыя і свежыя. А на хвалі «грыбной ліхаманкі», асабліва калі грыбны сезон радуе ўраджаем, у лес адпраўляецца мноства гараджан, якія часам не ў стане адрозніць ядомыя грыбы ад умоўна-ядомых і нават атрутных.

## З ІМІ ЖАРТАВАЦЬ НЕ ВАРТА

«Купіў грыбоў. Пасмажыў. На ўсякі выпадак памыўся, пагаліўся, надзеў усё новае. Сяджу, ем». Гэта стары, «барадаты» анекдот. Але, як вядома, у кожным жарце ёсць доля праўды. Пра тое, як не атруціцца грыбамі, медыкі гавораць і пішуць з году ў год. Падрабязна пісала пра гэта і «Звязда» — і летась, і пазалетась. Так што зараз толькі паўторым асноўныя тэзісы.

— Атручванне выклікаюць як атрутныя грыбы (мухаморы, бледныя паганкі, ілжывыя апенькі і г. д.), так і няякасныя ядомыя: тыя, якія доўга захоўваліся, пакрытыя сліззю, — перасцерагае валеолаг 27-й гарадской паліклінікі Мінска Лілія Кацер.

Пры гэтым тэрмічнае ўздзеянне не разбурае атрутных рэчываў у грыбах: засцерагчы сябе, пракіпяціўшы грыбы, не атрымаецца, падкрэслівае спецыяліст. Сітуацыя ўскладняецца і тым, што дакладна размежаваць атрутны грыб і неатрутны часам цяжка нават дасведчаным грыбнікам, бо народныя прыкметы не заўсёды «працуюць», калі справа датычыцца такога каварнага прадукту, як грыбы. Хаця ведаць гэтыя прыкметы усё ж варта. Напрыклад, у ядомых апенек карычнявата-жоўты капялюшык, а на ножцы — колцападобная плёнка. У лжывых — адценне капялюшыка чырванаватае або жоўта-зялёнае і няма колца на ножцы. Пад белыя грыбы пасяпяхова маскіруецца небяспечны жоўцевы і сатанінскі. Каб «вывесці іх на чыстую ваду», перакуліце грыб: калі ніжні бок капялюшыка не жоўценькі, а, скажам, ружовы ці нават чырванаваты, — перад вамі подлы ашуканец. Не ўпэўненыя — разламіце капялюшык: у баравіка ён на зломе не змяняе колер, самазванцы ў месцы злому спачатку пачырванеюць, а пазней — счарнеюць. І галоўнае правіла, вядомае нават гараджанам: ілжывыя, атрутныя грыбы часцей маюць зялёнае адценне пласцінак. І яшчэ яны непрыемна пахнуць. Важна таксама памятаць, што адзін і той жа від грыбоў можа мець розную таксічнасць у залежнасці ад месца і часу збору. Словам, не ўпэўнены — пакінь грыб у лесе. І ў цэлым, невядомыя грыбы ні ў якім разе не адпраўляйце на патэльню ці ў суп: рызыка магчымых наступстваў відавочна перавышае задавальненне ад такой стравы. І яшчэ некалькі правіл. Прайдзіце міма як зусім маладых грыбочкаў (у іх яшчэ недастаткова выявіліся знешнія прыкметы), так і старых грыбоў-пераросткаў (яны назапашваюць атрутныя рэчывы і ўтрымліваюць небяспечныя прадукты распаду бялкоў — гэта, дарэчы, да пытання аб грыбах-волатах, якімі любяць выхваляцца ў сацсетках грыбнікі). Тое ж самае датычыцца сухіх і абязводжаных грыбоў: пакіньце іх там, дзе яны ёсць. Аб тым, што грыбы лепш набываць у месцах санкцыянаванага гандлю, мы ўжо гаварылі.

Што рабіць, калі вы ўсё ж атруціліся грыбамі? Гэта значыць, калі на працягу паўгадзіны-сутак пасля ўжывання іх у ежу адчулі галавакружэнне і смагу, з'явіліся млоснасць, ваніты, дыярэя, а ў некаторых выпадках — нават курчы, тахікардыя, сіненне вуснаў і пазногцяў, ахаладжэнне рук і ног, збыітанасць свядомасці і парушэнне дыхання. Зразумела, тэрмінова тэлефанаваць «103». Але ў выпадку атручэння грыбамі сімптомы развіваюцца імкліва. Так што да прыезду медыкаў выпіце шмат вады і паспрабуйце ачысціць страўнік, выклікаўшы ваніты. Неабходна адсарбіраваць атрутныя рэчывы, так што выпіце актываваны вугаль: таблетка на 10 кг вагі. Калі няма дыярэі — прыміце слабільнае: арганізм важна ачысціць. Каб не дапусціць парушэння кровазвароту, прыкладзіце да ног грэлку або цёплы кампрэс. Кантралюйце артэрыяльны ціск і тэмпературу да прыезду «хуткай дапамогі».

Але гэта — крайні выпадак. Калі ставіцца да грыбоў з разумнай асцярожнасцю, грыбны сезон прынясе толькі радасць — і ў выпадку, калі на ціхае паляванне вы адпраўляецеся ў лес і калі ідзяце па грыбы на рынак. Бо апошнія тыдні лета ўжо з намі, і яны таксама пройдуць...

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
17 ЖНІЎНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15960)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Ганна САДОЎСКАЯ:

# «Хочацца перадаць сваё адчуванне краявідаў»

**Два гады, як наша гераіня скончыла аддзяленне станковага жывапісу Беларускай акадэміі мастацтваў. Гэта час, калі выпускнікі, як правіла, шукаюць сябе, але дзяўчына ўжо атрымала персанальную выстаўку ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі!**
**Амаль цэлы месяц наведвальнікі маглі аглядаць яе «Шляхі творчасці» — у экспазіцыі аб'ядналася каля 30 карцін мастачкі. Прапанову выставіцца ў галоўным музеі краіны яна атрымала пасля пленэру «Святло зямлі беларускай» — тады на творы Ганны звярнулі ўвагу і прапанавалі ёй зрабіць выстаўку пейзажаў. Пра любімы жанр і ўлюбёную справу ішла наша размова з маладой мастачкай:**



— У нашай краіне вельмі сур'ёзная пейзажная школа. Немагчыма не ўлічваць гэты факт у развіцці маладых аўтараў. А я ў пейзажы адчуваю сябе ўпэўнена і больш свабодна, чым у іншых жанрах. Бо пейзажам займаюся даволі даўно, першыя сур'ёзныя спробы былі падчас вучобы ў акадэміі мастацтваў. З таго часу, як у нас былі выязныя пленэры, калі мы малявалі прыроду — лавілі яе стан, адзначалі колер, — імкнулася перадаць паветра і настрой. Важнай часткай працы было стварэнне пейзажа — вялікай карціны.

Калі звярнуцца да студэнцкай пары, то розныя творы эксперыментальнага характару заўсёды мелі месца, але да пейзажа я звярталася часцей за ўсё. У мяне часам здараюцца партрэты, часам — нацюрморты, але калі вяртаюся да прыроды, калі імкнуся прапрацаваць эцюды, створаныя на пленэрах, то ўсё атрымліваецца больш проста: значна лягчэй ідзе думка, хочацца эксперыментаваць, гуляць з памерам. Гэта, дарэчы, можна адчуць на выстаўцы, бо тут прадстаўлены адзін з самых маштабных маіх твораў — трыпціх «Блакіт». Ён распавядае пра тры самыя вялікія водныя сістэмы Беларусі — Заходнюю Дзвіну, Блакітныя азёры і балота Ельня.

Гэта работа не давала мне спакою некалькі гадоў. Толькі кажуць, што галоўнае — прыдумаць вобраз і пачаць — а далей само пойдзе. Насамрэч спатрэбілася шмат часу і цярплівасці, бо хацелася паказаць непаўторную прастору, што аб'яднала сіняву вады, сінь неба, даляў. Хацелася стварыць вобраз Беларусі, якая не толькі на словах, а па сутнасці сінявокая краіна. Хацелася перадаць адчуванне высокага палёту над гэтай прасторай. Таму ўзнік трыпціх — і яго добра прынялі дзякуючы камандзе музея. Калі складалася экспазіцыя, творы вырашылі размясціць не на адной сцяне, а на трох, каб з розных бакоў гледача атачаў гэты блакіт.

***— Яшчэ адметнасць — выстаўка разбіта на зоны...***

— Такое рашэнне каманды Нацыянальнага мастацкага для мяне было нечаканасцю, але аказалася ўдалай знаходкай. Можа, і выпадкова, але скампанавалі прынцыповыя моманты, калі ў адной зоне прадстаўлены пейзаж, які быў створаны ў 2017 годзе, калі я была студэнткай другога курса, а побач вісіць твор 2023 года. Відавочная розніца ў падыходах, у тэхнічных момантах, нават у назвах. Тады былі першыя спробы, а цяпер — сінтэз працы на пленэрах, у майстэрні, еднасць выхаду творчай энергіі і мастацкай задумы.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Камертон настрою

# КАМЕННЫ СЛЕД У ГІСТОРЫІ

**Горад Гарадок, што на Віцебшчыне, сёлета будзе сустракаць гасцей і ўдзельнікаў XXX юбілейнага Дня беларускага пісьменства. Ужо з зімы інфраструктура населенага пункта мяняе сваё аблічча, цэнтральны гарадскі сквер таксама прыемна здзівіць гарадчан. Зусім хутка яго ўпрыгожаць шэсць каменных скульптур, над якімі шчыруюць студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.**



*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Прыемнае з карысным

# На варце здароўя — малады дэсант

**Сёлета ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім каледжы імя акадэміка І. П. Антонава ўпершыню медыцынскі студэнцкі атрад аб'яднаў найлепшых і апантаных студэнтаў. Самастойная форма працаўладкавання моладзі цяпер набыла новую, больш грунтоўную абалонку. На трэці працоўны семестр у Віцебскую абласную клінічную бальніцу заступіў студатрад «Артэрыя» імя Героя Савецкага Саюза Л. М. Філіпенкі, але іх гісторыя не скончыцца разам з летам.**

Колькасць яго байцоў зусім невялічкая — усяго пяць чалавек, з якіх чатыры дзяўчыны. Відома, права ўзначальваць «Артэрыю» было дадзена адзінаму хлопцу Антону Міхневічу. Ён трапіў у студатрад выпадкова: як і ўсе таварышы-медыкі шукаў на лета падпрацоўку па спецыяльнасці. Хацеў і веды на практыцы адтачыць, і быць фінансава самастойным.



«Аб тым, што ў нас у каледжы набіраюць студатрад, мне расказалі сябры. І я вырашыў, што гэта класная магчымасць сумясціць прыемнае з карысным: і паспрабаваць сябе ў медыцыне, і адчуць камандны зладжаны дух. Пакуль вучыўся, заўсёды марыў паназіраць за работай медыкаў на «ўнутранай кухні», тым больш што і падзарабіць можна добра. А гэта мне, даросламу хлопцу, патрэбна», — дзеліцца Антон.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Гэта — мы!

# МЭТАНАКІРАВАНАСЦЬ І РАБОТА НАД САБОЙ

## Сучасныя падлеткі не збіраюцца плыць па цячэнні

**Ці патрэбныя юнакам і дзяўчатам XXI стагоддзя сацыяльна-эмацыянальныя навыкі? Якія з іх адыгрываюць найбольш важную ролю ў паспяховай сацыялізацыі падрастаючага пакалення? Ад чаго залежыць дасягненне поспеху ў жыцці? Што адбудзецца, калі навучыцца кантраляваць свой унутраны свет? Ці дапаможа гэта здольнасць гарманізаваць сучаснасць і пабудаваць шчаслівую будучыню? Гэтыя і іншыя пытанні аказаліся прадметам даследавання, праведзенага сярод мінскіх падлеткаў спецыялістамі Нацыянальнага інстытута адукацыі пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь.**

Яго ўдзельнікамі сталі навучэнцы 9-х і 11-х класаў мінскіх гімназій і школ, падзеленыя на тры фокус-групы. Апошнія маюць на ўвазе арганізацыю даследавання з дапамогай групавога інтэрв'ю, калі некалькі чалавек пад кіраўніцтвам мадэратара абмяркоўваюць пэўную тэму, выказваюць меркаванне адносна прапанаваных мадэратарам пытанняў, абменьваюцца ідэямі і думкамі, якія ўзнікаюць у ходзе абмеркавання. Для правядзення даследавання ўпраўленнем маніторынгу якасці адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі быў падрыхтаваны сцэнарый з дакладна акрэсленымі этапамі і пытаннямі.

Як паказалі вынікі фокус-груп, навучэнцы 9-х класаў лічаць найбольш значнымі для ўласнай жыццядзейнасці наступныя ўменні: здабываць карысны для сябе досвед у выпадку няўдачы; весці дыялог, дамаўляцца і сумесна знаходзіць канструктыўныя рашэнні; казаць «не», каб не шкодзіць сабе; аналізаваць (разумець) учынкі іншых людзей, іх прычыны і матывы; выказваць і адстойваць уласны пункт гледжання; абараняць уласныя інтарэсы; вывучаць свой унутраны свет, аналізаваць яго асаблівасці; адказваць за словы, учынкі, вынікі дзейнасці.

Навучэнцы 11-х класаў у якасці найбольш актуальных сацыяльна-эмацыянальных навыкаў згадалі наступныя: работу над сабой і сваім характарам; выпрацоўку карысных звычак; гатоўнасць і здольнасць пры неабходнасці выказваць нязгоду з іншымі людзьмі; прыняцце адказнасці за ўласныя словы і ўчынкі; эмацыянальны самакантроль; матывацыю сябе на дасягненне мэт, якія патрабуюць намаганняў; разуменне і прыняцце пункту гледжання іншага; вырашэнне канфліктных сітуацый.

У працэсе камунікацыі з навучэнцамі прасочвалася разуменне маладымі людзьмі значнасці сацыяльна-эмацыянальных навыкаў, жаданне іх фарміраваць і ўдасканальваць. Відавочна, што моладзь не мае намеру плыць па цячэнні і збіраецца кіраваць сваім жыццём. Сярод магчымасцяў для фарміравання неабходных для жыцця навыкаў юнакі і дзяўчаты згадвалі дадатковую адукацыю (гурткі, секцыі, трэнінгі і інш.).

Сярод найбольш актуальных праблем, з якімі сутыкаецца сучасная моладзь, былі выдзелены булінг і кібербулінг. Таксама была адзначана важнасць эмацыянальнай падтрымкі і разумення з боку дарослых, важнасць цёплых, а не фармальных сямейных адносін.

У якасці найбольш яркіх, ва ўяўленні навучэнцаў, прыкмет паспяховай асобы ўказваліся мэтанакіраванасць, высокая самаацэнка, аптымізм, крэатыўнасць, адкрытасць новаму, самавалоданне. Гэтыя і іншыя якасці асобы знайшлі адлюстраванне ў вобразах ідэальнай дзяўчыны і ідэальнага юнака XXI стагоддзя. Хлопцам і дзяўчатам была дадзена магчымасць абмеркаваць свае ўяўленні ў мікрагрупах і прэзентаваць вынікі работы ў выглядзе малюнкаў і вуснага апісання.

Вынікі правядзення фокус-груп пацвердзілі зацікаўленасць моладзі ў фарміраванні сацыяльна-эмацыянальных навыкаў, якія ў вялікай ступені ўплываюць не толькі на акадэмічную і персанальную паспяховасць, але і на фізічнае, псіхічнае, сацыяльнае здароўе грамадства, яго эканамічныя вынікі, што адпавядае мэтам устойлівага развіцця краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Даніна пашаны

# Патрыятычнаму цэнтру — статус маладзёжнай будоўлі

**Аб'ектам будаўніцтва адукацыйна-аздараўленчай установы «Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі» на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці прысвоены статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. Адпаведны Указ № 257 Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 9 жніўня.**

Прысваенне аб'ектам Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі ў Брэсцкай крэпасці статусу Усебеларускай маладзёжнай будоўлі — знак высокага даверу моладзі з боку кіраўніцтва краіны і яе лідара, заявіў першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў.

«Тое, што на працягу ўжо другога года моладзі даваряюць такія важныя аб'екты, для нас вельмі сур'ёзная падтрымка і адказнасць. Я, вядома, перакананы, што шэрагі добраахвотнікаў (не толькі байцы студэнцкіх атрадаў БРСМ, а таксама актывісты, валанцёры) будуць цягнуцца ўсенародным парывам, як гэта было ў «Хатыні», каб паўдзельнічаць у будаўніцтве такога знакавага аб'екта», — падкрэсліў Аляксандр Лук'янаў.

Паводле яго слоў, Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці — унікальны і неабходны аб'ект для ўсёй постсавецкай прасторы. «Я думаю, што на тэрыторыі будаўніцтва патрыятычнага цэнтра будзе працаваць не толькі наша беларуская моладзь, але і хлопцы і дзяўчаты з іншых краін былога Савецкага Саюза», — адзначыў кіраўнік БРСМ.

«А тая акалічнасць, што Прэзідэнтам была падтрымана ініцыятыва простага байца студэнцкага атрада, падкрэслівае трапяткое стаўленне кіраўніка нашай краіны. Наша задача — не падвесці і зрабіць усё неабходнае, каб рэалізаваць чарговую амбіцыйную задачу і рухацца далей».

З ініцыятывай надаць Рэспубліканскаму цэнтру патрыятычнага выхавання моладзі статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі выступілі байцы студэнцкіх атрадаў. Студэнт Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Сямён Люлькові звярнуўся з такой прапановай да Прэзідэнта ў час Паслання кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і парламенту.

Аляксандр Лукашэнка даручыў ініцыятыву прааналізаваць і вывучыць. «Мы вывучым гэтую вашу прапанову. Тым больш вы мне людзі не чужыя, родныя, — адказаў Прэзідэнт. — Калі моладзь, БРСМ да гэтага падключацца, я буду вельмі рады аб'явіць гэтую будоўлю маладзёжнай. Тым больш у «Хатыні» вы нас не падвялі».

У маі Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы прыняў рашэнне аб'явіць збор сродкаў на рэканструкцыю цэнтра. Зусім нядаўна іх збор аб'явіў і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. На будаўніцтва цэнтра была накіравана палова сродкаў, сабраных на рэспубліканскім суботніку, гэта амаль 7 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, дзяржаўныя і камерцыйныя арганізацыі ахвяравалі больш як 550 тысяч. Яшчэ крыху больш як 20 тысяч паступіла ад грамадзян. Пры гэтым вядома, што першая чарга будаўніцтва, якая вызначана праектна-каштарыснай дакументацыяй, запатрабуе каля 30 мільёнаў рублёў.

Па ўказе да работ на гэтых аб'ектах будуць прыцягнуты маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 31 года, у тым ліку ў складзе студэнцкіх атрадаў. Гэты дакумент будзе садзейнічаць працоўнаму выхаванню моладзі, фарміраванню ў яе пачуцця датычнасці да гісторыі роднай краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАМЕННЫ СЛЕД У ГІСТОРЫІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

«Надзея», «Князь», «Летапісец» — такія і іншыя назвы падабралі для сваіх работ студэнты другога і трэцяга курсаў, якія з 15 ліпеня прыступілі да працы ў паўночным рэгіёне. Ім, маладым і натхнёным скульптарам, выпала магчымасць пакінуць свой значны след у гісторыі Віцебшчыны, што для карэнных мінчан асабліва ганарова.



**Насця Сіпач.**

Насця Сіпач вучыцца на другім курсе акадэміі, гэта яе першая работа з каменя такой велічыні. Эскіз, як і ідэю, закладзеную ў скульптуру, дзяўчына стварала сама і назвала яе па-дзявоцку пяшчотна «Надзея». «Гэта сінічка, якую трымаюць старыя працавітыя рукі. У сваю работу я ўкладаю ідэю таго, што, дзе наступае канец, заўсёды нараджаецца новае жыццё. Калі прыглядзецца да птушачкі, то грудка і крылы яе выраблены ў форме сэрцайкаў — гэта любоў да бліжняга і навакольнага свету», — дзеліцца дзяўчына. Насця прызнаецца, што абыходзіцца з працоўным інструментам ёй няцяжка, галоўнае — захоўваць меры бяспекі і, вядома, берагчы здароўе. Кожны дзень яны з калегамі прадзімаюць свае сродкі індывідуальнай абароны, каб лёгкія раней часу не пацярпелі ад каменнага пылу. Цяпер дзяўчына працуе з мяккім гранітам, якім забяспечыла кіраўніцтва раёна з гарадоцкіх прастораў, а вось найбольш Насці падабаецца шамот — вогнетрывалая гліна, якая больш падатлівая ў жаночых руках.



**Данііл Бірукоў.**

Яе таварыш Данііл Бірукоў працуе над скульптурай пад урачыстай назвай «Князь». Хлопец цікавіцца гісторыяй, таму і свой аб'ект, які ўпрыгожыць Гарадок, прысвяціў гэтай тэме. «Старонкі нашай беларускай гісторыі — гэта нематэрыяльная спадчына кожнага грамадзяніна нашай краіны. І я лічу, што кожны з нас павінен яе захоўваць, не дазваляць перапісваць пад уплывамі часу. Бо любы чалавек павінен ведаць, адкуль яго карані, адкуль род пачаўся», — разважае Данііл. У сваёй скульптуры ён адлюстроўвае зборны вобраз князёў, таму і аблічча ў каменя няма, а спераду ёсць выява мяча. Для хлопца вопыт стварэння такой вялікай скульптуры не новы, у мінулым годзе ён працаваў над аб'ектам, які будзе ўпрыгожваць тэрыторыю клінікі. Але пакінуць свой след на Гарадоччыне, тым больш да такога свята, юнаку вельмі пачэсна. «Скульптарамі становяцца нямногія, шмат хто за шэсць гадоў навучання не вытрымлівае гэта нялёгкае мастацтва. Але я з упэўненасцю магу сказаць, што для мяне, як і для маіх таварышаў, якія працуюць цяпер, скульптура — не штодзённасць, не праца, а лад жыцця. А самае цікавае на нашай ніве, што прыносіць асалоду, — магчымасць вучыцца і ўдасканальваць сваё рамяство ўсё жыццё», — расказвае Данііл Бірукоў.

Пакуль размаўляем з Насцяй і Даніілам, да нас на кароткі адпачынак падыходзіць яшчэ адзін юны скульптар Антон Гурскі. Ён абраў сабе самы высокі (130 сантыметраў у вышыню) і, як аказалася, самы цвёрды валун. Але гэта хлопца не бянтэжыць, ён, наадварот, з вялікім запалам кожны раз падыходзіць да граніту. «Мая скульптура носіць назву «Летапісец». Я імкнуўся адлюстраваць у ёй вытокі нашага беларускага пісьменства, сілу думкі і літаратурнае багацце. Думаю, што мая работа якраз упісваецца ў тэму вераснёўскага свята», — тлумачыць



**Антон Гурскі.**

ідэю Антон. Кожны дзень тут на працягу месяца падобны на папярэдні: наверсе пачатай скульптуры — міні-мадэль з пластыліну, інструмент і навушнікі. І гэта, прызнаецца юнак, для яго найлепшая медытацыя і спосаб адпачынку.

Маленькі і ўтульны Гарадок здзіўляе карэнных мінчан акуратнымі вулачкамі, дагледжанымі дарогамі і пабудовамі — адным словам, летняя практыка ў паўночным рэгіёне выдалася добрай. Адно толькі перашкаджала — надвор'е: у ліпені залівалі дажджы, у пачатку жніўня стаяла засуха, аднак усё атрымалася. Цяпер у гарадскім скверы падрыхтоўваюць пастаменты, пасля на іх з'явяцца каменныя аб'екты з шыльдамі, на якіх будуць нанесены імёны аўтараў і QR-коды, каб кожны ахвотны мог грунтоўна пазнаёміцца з ідэямі скульптур і тымі, хто стаіць за імі. А шэсць студэнтаў вярнуцца ў акадэмію з гонарам, што яны пакінулі свой каменны след у гісторыі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

*Камандны дух*

# «АЛІМПІЯ» З КАМСАМОЛЬСКІМ АГЕНЬЧЫКАМ

**Рэспубліканскі спартыўна-масавы фестываль для працоўнай моладзі «Алімпія-2023» аб'яднаў цягам трох дзён у палатачным гарадку на беразе ракі Ісляч ва ўрочышчы Дубы Валожынскага раёна больш за 800 юнакоў і дзяўчат — 21 маладзёжную каманду першасных арганізацый, галіновых камітэтаў БРСМ працоўных калектываў і ведамстваў з усёй краіны.**

Традыцыйна прадстаўніцтва «алімпійцаў» на фестывалі было больш чым сур'ёзнае — зборныя каманды Беларускай чыгункі, Мінсктранса, «БЕЛАЗа», «БМЗ», «Мінскага трактарнага завода», «Магілёўліфтмаша», канцэрна «Беллегпрам», ААБ «Беларусбанк», Мінадукацыі, абласных і Мінскага камітэтаў БРСМ. Здаровую канкурэнцыю падчас спартыўных і творчых спаборніцтваў ім склалі маладзёжныя каманды «Нафтана», «Белаўтамаза», Мінскага электратэхнічнага завода імя В. І. Казлова, слуцкага ААТ «Кранавы завод», Скідальскага цукровага камбіната — навічкі праекта.



Фота з сайта БРСМ.

Кожны год фестываль праходзіць па пэўнай тэматыцы. Сёлета фэст працоўнай моладзі быў прысвечаны 105-годдзю УЛКСМ. І прайшоў пад агульным слоганам «Не расстануся з камсамолам, буду вечна маладым...» У сувязі з гэтым на «Алімпіі-2023» дзейнічала правіла нашэння любога атрыбута камсамольца, уключаючы значкі, элементы адзення, абутку і іншыя. Яно прымянялася як да каманд-удзельніц, так і да журы і гасцей фестывалю. «Камсамольская» праграма «Алімпіі» была насычана конкурсамі і інтэрактывамі.

Па-за ёй удзельнікі фестывалю маглі здаць нарматывы патрыятычнага фізкультурна-спартыўнага комплексу «Гатовы да працы і абароны!»: чаўночны бег, скачкі ў даўжыню, адцісканні (хлопцы), уздым тулава (дзяўчыны), нахіл тулава наперад, зборка / разборка аўтамата на час, аказанне першай медыцынскай дапамогі, а таксама паўдзельнічаць у спаборніцтвах па міні-футболе і валейболе.

Цэнтральнай падзеяй першага фестывальнага дня стаў адкрыты дыялог «Спадчына ў будучыню» з удзелам «алімпійцаў» і экспертаў — вядомых дзяржаўных дзеячаў, якія атрымалі камсамольскую загартоўку. Па задумцы арганізатараў, дыскусія прайшла ў фармаце камсамольскага сходу са стылізаваным афармленнем атрыбутамі — трыбунай, сталом з чырвоным абрусам і г. д., а акрамя таго — выбранnем ганаровых гасцей у склад прэзідыума, міні-дакладамі на зададзеную тэму, спрэчкамі з удзелам камсамольцаў.

Пры падтрымцы Клуба інтэлектуальных гульняў ААТ «ААБ Беларусбанк» «Плацінавая Сава» ў праграме «Алімпіі» быў назначаны турнір па інтэлектуальных гульнях «Наш родны камсамол, удзячныя табе за навуку па сумленні жыць» (каманды гулялі адначасова па прынцыпе: «пытанне — «мазгавы штурм» — адказ») і конкурс на найлепшую аўтарскую песню «Няхай песні раскажуць, якімі мы былі...»

У выніку пераможцам стала каманда галіновага камітэта БРСМ ААТ «ААБ Беларусбанк». На другім месцы размясцілася каманда Віцебскай абласной арганізацыі БРСМ, трэцім — ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК».

Арганізатарам рэспубліканскага спартыўна-масавага фестывалю «Алімпія-2023», выступіў БРСМ пры падтрымцы міністэрстваў адукацыі, спорту і турызму, Мінскага аблвыканкама. Праект рэалізоўваецца з 2004 года па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Навука «ў полі»*

# МІЖНАРОДНЫ ГЕАЛАГІЧНЫ ЗАЛІК ПРОЙДЗЕНЫ!

**Беларускія школьнікі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў БДУ сталі сярэбранымі прызёрамі міжнароднага заліку XIV Усерасійскай адкрытай палявой алімпіяды юных геолагаў у Татарстане.**

У склад нацыянальнай каманды «Юныя геолагі Рэспублікі Беларусь» увайшлі навучэнцы 8—11 класаў сталічнай гімназіі № 5 імя героя ў сустрэчы на Эльбе Паліна Вільчак, Ганна Вайцяховіч, Даніл Гінько, Багдан Канстанцінаў, Міхаіл Гаспадарык, Арсеній Лазарэвіч, Сафія Тазіева і Марыя Загарэўская. Раней яны сталі пераможцамі Беларускай алімпіяды юных геолагаў, VI Казахстанскай адкрытай палявой алімпіяды юных геолагаў і прызёрамі VIII Рэспубліканскай адкрытай палявой алімпіяды юных геолагаў у Татарстане.



Фота прэс-службы БДУ.

Кіраўнікамі беларускай каманды выступілі дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Інстытута дадатковай адукацыі БДУ, старшы выкладчык кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі Уладзімір Махнач і дырэктар мінскай гімназіі № 5 імя героя ў сустрэчы на Эльбе Жанна Гвозд.

Алімпіяда складалася з 11 шматпрафільных геалагічных спаборніцтваў. Яны ўключалі тэарэтычныя пытанні і выкананне ў палявых умовах практычных заданняў па гідралогіі, геалагічным маршруце, апісанне геалагічнага помніка прыроды, заданні па радыеметрыі, мінералогіі і інш. У рамках чатырох конкурсаў і навукова-практычнай канферэнцыі Ганна Вайцяховіч, Багдан Канстанцінаў і Сафія Тазіева ўвайшлі ў топ-20 найлепшых алімпіяднікаў.

Усяго ў міжнародным заліку за тры прызавыя месцы змагаліся толькі найлепшыя прадстаўнікі з Беларусі, Расіі, Казахстана і Узбекістана. Першынство засталося за камандай Расіі, а трэцяе месца заваявала зборная Узбекістана.

У гэтым годзе спаборніцтвы праводзіліся ў вочным фармаце ў горадзе Альмецьеўску (Рэспубліка Татарстан). У алімпіядзе прынялі ўдзел больш за 350 школьнікаў. Навучанне зборнай беларускіх геолагаў прайшло на базе факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ пры падтрымцы філіяла «Інстытут геалогіі» Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі».

Удзел у гэтым конкурсе дазваляе школьнікам сфарміраваць прафесійныя, інжынерныя і даследчыя навыкі, а таксама абмяняцца вопытам са сваімі аднагодкамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# На варце здароўя — малады дэсант

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Ён — адзіны прадстаўнік моцнай палавіны чалавецтва ў сваім калектыве студатрадаўцаў, але гэта юнака ніяк не бянтэжыць. Хлопец упэўнены, што ў медыкаў не павінна быць падзелу на мужчын і жанчын, у кожнага з тых, хто вырашыў абраць для сябе гэты нялёгкі шлях, адна мэта — дапамагаць людзям. Таму ў «Артэрыі» дзявочыя сціпласці і юнацкае абаянне адышлі на другі план.

«Спачатку было няпроста звыкнуцца з рэжымам: начныя дзяжурствы, сур'ёзная адказнасць за свае дзеянні. Але больш чым за месяц жыццё ўвайшло ў новую каляіну, мне падабаецца», — расказвае хлопец. Ён, дарэчы, быў абраны ў студатрад не толькі з-за добрай паспяховасці ў каледжы, але і з-за актыўнай грамадзянскай пазіцыі: Антон — пастаянны ўдзельнік святочных канцэртаў і дабрачынных акцый. Атрымліваецца, што пакуль яму ўдаецца сумяшчаць творчы пачатак і лячэбнае мастацтва.

Як расказала **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Анжэла АЗАРЧАНКА,** такі вопыт для каледжа ў навінку. «Звычайна нашы студэнты працаўладкоўваліся самастойна, а сёлета, дзякуючы актыўнаму ўзаемадзеянню з раённым камітэтам Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, мы вырашылі аб'ядначы ахвотных і найлепшых навучэнцаў у студатрад. Але такая форма работы з найвальнікам не скончыцца летнім сезонам — «Артэрыя» будзе працаваць круглы год. Гэта дае магчымасць моладзі набірацца практычнага досведу разам з тэарэтычнымі ведамі, што будзе добрай падставай выпускнікам пры працаўладкаванні пасля каледжа».

Дзяўчаты і хлопец працуюць медсёстрамі і медбратам. Змены, якія доўжацца па 12 гадзін, для дзяўчат лёгка не праходзяць, але, як той казаў, што нас не забівае, робіць нас мацнейшым. Нягледзячы на першыя практычныя крокі ў прафесію, байцы шчыруюць у бальніцы нараўне з штатным персаналам, ніякіх знікак на ўзрост. Вядома, пакуль да складаных маніпуляцый студэнтаў не дапускаюць, аднак яны дапамагаюць пацыентам перамяшчацца і абслугоўваць сябе, дэзынфіцыруюць інвентар і памяшканні. Адна з дзяўчат, Паліна Магучая, дзеліцца, што ўжо давялося сутыкнуцца і з цяжкімі пашкоджаннямі: глыбокімі ранамі і крывёю. І, стрымліваючы дзявочую ўражлівасць, прыходзіцца аказваць неабходную медыцынскую дапамогу: накладваць павязкі, зашываць раны.

Пакуль члены атрада «Артэрыя» ў поўным захапленні ад першых крокаў на медыцынскай ніве. Плануюць як мінімум працаваць у бальніцы да зімы, а пасля ўжо будзе відаць. Вядома, што падчас заняткаў у каледжы сумяшчаць начныя дзяжурствы з лекцыямі будзе няпроста, аднак медык вучыцца ўсё жыццё.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

*Погляд праз час*

# «ПАМЯЦЬ І СЛАВА»: ПАДЗЕІ, ВЕРНУТЫЯ З АРХІВАЎ

**Студэнцкі сэрвісны атрад «Памяць і Слава» імя першага рэктара БДУ Уладзіміра Іванавіча Пічэты завяршыў работу ў трэцім працоўным семестры. Байцы працавалі над даследаваннем архіўных дакументаў аб акадэмічнай супольнасці ВНУ, якія ўнеслі ўклад у развіццё айчыннай і сусветнай навукі, для наступнага захавання і перадачы гістарычнай спадчыны.**



Фота прэс-службы БДУ.

Студэнты гістарычнага факультэта БДУ займаліся вывучэннем публікацый цэнтральнага перыядычнага друку Беларусі перыяду 60—70-х гг. XX ст. у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Даследаваліся выпускі газет «Звязда», «Советская Белоруссия» і «Беларускі ўніверсітэт». Маладыя гісторыкі выявілі звыш 200 нататак і артыкулаў са згадкамі БДУ. У выніку былі створаны спісы прафесарска-выкладчыцкага складу, даследавана дзейнасць ВНУ ў пасляваенны перыяд, а таксама праведзена работа па папаўненні летапісу першаснай прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў БДУ. Дзеля гэтага студэнты вывучылі звыш дзесяці архіўных спраў агульнай сумай у 2000 лістоў, каб прасачыць дынаміку колькасці складу прафсаюза.

Акрамя таго, студатрад працаваў над добраўпарадкаваннем пахаванняў студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта на Ваенных, Усходніх, Кальварыйскіх, Чыжоўскіх і Паўночных могілках Мінска. Усяго прыведзена ў парадак 109 месцаў спачыну. Адзначым, што работа па пошуку і добраўпарадкаванні пахаванняў супрацоўнікаў БДУ вядзецца з 2020 года.

Трэцякурснік гістарычнага факультэта, камандзір «Памяці і Славы» Іван Квашко падзяліўся ўражаннямі: «Сёлета беларускі студатрадаўскі рух адзначае 60-гадовы юбілей. За гэты час быў праведзены велізарны пласт работы, і я з гонарам прызнаю: мы захавальнікі багатай спадчыны, тых здзяйсненняў папярэдніх пакаленняў, якія трэба берагчы. Для мяне гэтая работа — перш за ўсё магчымасць аддаць даніну памяці тым, хто працаваў на карысць Радзімы і альма-матар. У яе рэалізацыі нам вельмі дапамагаюць нашы куратары — дэкан гістарычнага факультэта БДУ Аляксандр Кахановскі, загадчык кафедры гісторыі Расіі Алег Яноўскі і кіраўнік праекта, намеснік дэкана Аліна Верамейчык».

У хуткім часе будзе праведзены круглы стол, на якім калектыў факультэта больш падрабязна разгледзіць вынікі работы і паставіць задачы на наступны год. На гэты момант распрацоўваецца інтэрактыўная карта пахаванняў на названых могілках, лічбавая база даных, а асобная ўвага — стварэнню цыкла дакументальных фільмаў аб БДУ і папаўненню фотаархіва ўніверсітэта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «БЫЛО Б ЖАДАННЕ, А МАГЧЫМАСЦЯЎ У НАШАЙ СФЕРЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЗВЫШДАСТАТКОВА»

## Работніца банкаўскай сферы пра амбіцыі, кар'ерны рост і працагалізм

**Кваліфікаваная і прафесійная дапамога ў фінансавых пытаннях у сучасным свеце важная, мабыць, не менш за медыцынскую, бо ўменне разумна распараджацца сваімі фінансамі — шлях да матэрыяльнай стабільнасці, унутранага спакою і пачуцця абароненасці. Аб тым, чаму дзяўчаты выбіраюць сваёй жыццёвай дарогай «сухую», дакладную і чужую ўсякай рамантыцы сферу фінансаў, мы спыталі ў маладога кіраўніка адной з банкаўскіх структур, менеджара па абслугоўванні прыватных кліентаў Ганны ФЁДАРАВАЙ.**



### ХТО ГЭТАГА ХОЧА, І ХТО ГЭТА МОЖА

— Мая пасада гучыць дастаткова доўга і складана, — удакладняе суразмоўніца. — Я менеджар па абслугоўванні прыватных кліентаў Аддзела рознічных продажаў Цэнтра банкаўскіх паслуг № 701 Рэгіянальнай дырэкцыі па горадзе Мінску ГА «Белаграпрамбанк». «Белаграпрамбанк» — маё першае месца працы пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта: працаваць сюды прыйшла ў 2016 годзе на пасаду касіра. Я — чалавек вельмі амбіцыёзны, мне ўсё цікава. І гэтую маю цікавасць да ўсяго новага, імкненне развівацца ў прафесіі заўважыла кіраўніцтва. Праз год працы я сышла ў галаўны офіс. Гэта быў самы цікавы час: я займалася ўсім: і крэдытамі, і ўкладамі, і карткамі, ездзіла ў арганізацыі і на прадпрыемствы, калі банк прыцягвалі на зарплатнае абслугоўванне. Вельмі шмат чаму там навучылася. На пасадзе кіраўніка я з лютага 2019 года, у маім аддзеле — восем чалавек.

***— Гэта ж вельмі хутка: усяго тры гады ад выпускніцы да кіраўніка аддзела...***

— Так, але гэта ў цэлым кадравая палітыка ў фінансавай сферы: дапамагаць моладзі і рабіць на яе стаўку. Наш банк заўсёды спрыяў кар'ернаму развіццю маладых спецыялістаў: калі яны хочуць развівацца і гатовы прыкладаць да гэтага намаганні, кіраўніцтва не ставіць ніякіх абмежаванняў. Жаданне рэалізоўваць сябе ў прафесіі ўвогуле ўласціва сучаснай моладзі. І заўсёды вельмі заўважна, хто гэтага хоча і хто гэта можа. Прычым у прыярытэце менавіта «хоча». Зразумела, што вопыт у любой прафесіі напрацоўваецца гадамі, але калі чалавек жадае развівацца, гэта яму заўсёды дапаможа. Цяпер многія маладыя спецыялісты, якія прыходзяць у банк, — выхадцы з каледжаў. Іншымі словамі, гэта моладзь, якая выбрала для сябе эканамічную сферу ўжо пасля 9 класа. Такія прыходзяць «на касу», там напрацоўваюць вопыт. І, зразумела, яны імкнуцца прадоўжыць адукацыю. Тут банк таксама ніколі не стварае абмежаванняў — больш за тое, гатовы аплаціць вышэйшую адукацыю сваіх маладых спецыялістаў. Хлопцам і дзяўчатам трэба адпрацаваць пэўны тэрмін, сабраць пакет дакументаў — і можна паступаць, а вучобу аплаціць банк. Словам, было б жаданне, а магчымасцяў у нашай сферы дзейнасці звышдастаткова. Я не ведаю ніводнай іншай сферы і ніводнага іншага банка, дзе былі б створаны такія камфортныя ўмовы для прафесійнага развіцця маладых спецыялістаў. Ну, а акрамя таго, што ў банкаўскай сферы прынята клапаціцца аб камфортных умовах працы, у нашым банку яшчэ і вельмі ярка «афарбоўваюць» вольны час сваіх супрацоўнікаў.

***— Вы кажаце аб прафсаюзнай працы?***

— Дакладна так. Апроч таго, што я менеджар, я таксама з'яўляюся старшынёй першаснай прафсаюзнай арганізацыі нашай рэгіянальнай дырэкцыі. І гэтая праца таксама мне вельмі блізкая. Каб расказаць пра ўсе нашы мерапрыемствы, не хопіць і дня. Наш год пачынаецца з таго, што 1 студзеня мы плануем актыўнасці на выхадныя і святочныя дні: упісваем у графік спачатку пастаянныя мерапрыемствы, якія ўжо сталі добрай традыцыяй у нашым банку, потым дадаём нейкія яшчэ. У выніку разумеем, што вольных выхадных практычна не застаецца. Асабліва шмат актыўнасцяў увесну, улетку, ранняй восенню: турзлёты, велапрабегі, сплавы на байдарках... Але і ў халодную пару года сумаваць няма калі. Наведваем розныя выставы, канферэнцыі. На ўсе святы ладзім тэатралізаваныя паказы, падыходзім да пытання сур'ёзна: пішам сцэнарыі, ставім танцы, спяваем, закупляем падарункі нашым работнікам, не забываем таксама пра дзяцей супрацоўнікаў банка.

### «У ДЗЯЦІНСТВЕ МАРЫЛА СЛУЖЫЦЬ У АРМІІ...»

***— Фінансавая сфера — вельмі сур'ёзная, дакладная, памылак не даруе. Ці даводзілася вам на пачатку прафесійнага шляху даказваць сваю кваліфікаванасць больш дасведчаным і сталым калегам?***

— Даказваць некаму нешта — не, не даводзілася. Зразумела, спачатку ты зарабляеш сабе прафесійную рэпутацыю, а потым ужо рэпутацыя працуе на цябе, да цябе з'яўляецца давер як да спецыяліста. Але мне заўсёды было камфортна ў гэтым асяроддзі. Напэўна, магу сказаць пра сябе, што я кар'ерыстка — у добрым сэнсе гэтага слова. Гэта значыць, я арыентавана на кар'еру і пастаянны прафесійны рост. А ўвогуле, каб цябе палюбіла твая работа, ты павінен сам спачатку палюбіць яе. Мне заўсёды падабалася тое, што я раблю. А калі табе падабаецца тое, што робіш, не даводзіцца нікому нічога даказваць — усё адбываецца само сабой. Я працаголік, і калі мне цікава знайсці рашэнне, выканаць нейкую задачу, магу застацца пасля заканчэння працоўнага дня і на гадзіну, і на дзве, і даўжэй — мне гэта нескладана. Тым больш што мой працоўны час напоўнены, акрамя прафесійных пытанняў, і іншымі цікавымі задачамі — прафсаюзнымі. Так што, бывае, даводзіцца затрымлівацца, каб утрымаць раўнавагу паміж працай і маімі творчымі здзяйсненнямі. І гэта ў радасць.

***— Вы з дзяцінства хацелі працаваць у банку?***

— Зусім не. У дзяцінстве я хацела служыць у арміі. Мой тата — ваенны, у нас — афіцэрская дынастыя. Вырасла я ў ваенным гарадку. Воінская часць размяшчалася ў горадзе Бярозе Брэсцкай вобласці, і ўсе мае аднакласнікі былі дзецьмі ваенных. У такой атмасферы мы і выхоўваліся: самымі яркімі святамі былі дні часці, і я так любіла гэтую атмасферу, што збіралася паступаць у Ваенную акадэмію. Тата быў супраць, ён лічыў, што ваенная служба — справа мужчын, а не жанчын, аднак я гарэла гэтай думкай. Але якраз падчас заканчэння майго адзінаццатага класа быў часова спынены набор дзяўчынак у ваенныя ВНУ на цікавыя для мяне спецыяльнасці. Я разгубілася, разглядала абыходныя шляхі, думала, як мне ўсё ж трапіць у лік курсантаў. Але мой бацька — вельмі мудры чалавек: ён ніколі не казаў «Ты туды не пойдзеш», але заўсёды прыводзіў у размове разумныя аргументы. І гэта дало свой плён: я стала думаць і аб іншых прафесійных сферах. Выбрала БДЭУ, і бацькі адобрылі гэтае рашэнне... Мы з братам выхоўваліся ў абсалютнай любові. У нашай сям'і быў, як мне здаецца, ідэальны баланс: строгі, нават суровы бацька і пяшчотная мама, якая дорыць дзецям каханне і клопат. Мая мама — хатняя гаспадыня, яна прысвяціла жыццё нам з братам. Раней я заўсёды імкнулася быць строгай і сур'ёзнай, як тата, але па меры сталення адчуваю ў сабе ноткі мяккасці, гэта ў мяне ад мамы... Вяртаючыся да выбару прафесіі: я доўга вагалася паміж менеджментам і бухгалтарскім улікам. Але, дзякуй богу, выбрала першае. Зразумела, што не памылілася, калі ва ўніверсітэце быў курс бухгалтарскага ўліку. Аказалася, што для мяне гэта занадта аднастайна. Мне трэба больш разнастайнасці, важна, каб «карцінка» ўвесь час мянялася...

### ГАТОЎНАСЦЬ БРАЦЬ НА СЯБЕ АДКАЗНАСЦЬ

***— Ці ёсць у вас правілы, якія дапамагаюць дамагацца высокіх вынікаў, адаптавацца да складаных сітуацый?***

— Не, дакладных правілаў няма. Што датычыцца працы кіраўніка, яна навучыла мяне наладжваць добразычлівыя працоўныя ўзаемаадносіны з людзьмі. Калі ставіцца да калег добра, то і яны адкажуць табе ўзаемнасцю. Тое ж самае — з кліентамі банка. Калі ты гатовы дапамагчы людзям, то ў стасунках з імі абавязкова атрымаеш нейкую інфармацыю, або штуршок да развіцця, або новы кірунак думкі, якія ў будучыні табе спатрэбіцца. Я працую з моладдзю: сярэдні ўзрост у нашым філіяле — 33 гады. Калектыў, які ўзначальваю, жаночы. Кажуць, працаваць у такім складана, але насамрэч можна знайсці падыход да любога работніка. Важна зразумець і прыняць для сябе, што ўсе людзі розныя: у кожнага могуць быць асабістыя перажыванні, праблемы ў сям'і, проста дрэнны настрой. Але функцыя кіраўніка — пабудаваць работу так, каб кожны на працоўным месцы хацеў і мог прыкладаць максімум намаганняў і талент, каб усе задачы, пастаўленыя перад намі, выконваліся. Гаворка не пра «рычагі ўздзеяння» і не пра маніпуляцыі. Я стараюся быць сумленнай і шчырай з калегамі, і вакол мяне збіраюцца такія ж шчырыя, сумленныя і адказныя людзі.

***— На ваш погляд, дзякуючы якім якасцям характару ў банкаўскай справе можна дабіцца поспеху?***

— Перш за ўсё, неабходна працавітасць: калі ты гатовы працаваць і не ставіш для сябе рамкі васьмі працоўных гадзін. Ты разумееш, што гатовы зрабіць максімум, і не важна, ці паспееш ты, пакуль працоўны дзень не скончыцца, або крыху затрымаешся. Другое — гэта актыўная жыццёвая пазіцыя. Калі ты вырашаеш для сябе, што хочаш развівацца ў прафесіі, што табе гэта патрэбна. І трэцяе — гатоўнасць браць на сябе адказнасць. Гэта вельмі важнае ўменне, мусіць, у любой прафесіі. І гэта прыйшло да мяне таксама не адразу. Калі ў цябе ёсць начальнік, ты думаеш: яму лепш відаць, а я проста раблю свой кавалачак працы. Але надыходзіць пераломны момант — прынамсі, так было ў мяне. З'явіўся ўчастак працы, за які адказваю толькі я. І я зразумела, што змагу ўзяць на сябе гэтую адказнасць. У тым ліку — за іншых людзей. Мне не падабаецца, калі кліентаў пачынаюць «адфутбольваць» з аддзела ў аддзел: камусьці лянота разбірацца, хтосьці кажа: «Гэта не мая спецыфіка». У нашым банку такое ў прынцыпе не прынята. І я заўсёды імкнуся разабрацца ва ўсіх пытаннях да канца, не спрабуючы іх на кагосьці перакласці. Калі да нас прыходзіць кліент, не магу адпусціць яго без дакладнага разумення ў яго ў галаве вырашэння той праблемы, з якой ён звярнуўся.

***— А наколькі, па вашых назіраннях, фінансава адукаваныя сёння нашы суайчыннікі?***

— Наша насельніцтва досыць адукаванае ў фінансавым плане. Гэта вынік і працы дзяржавы ў цэлым, і працы банкаў. Сёння з кожнага тэлевізара расказваюць аб ашуканцах, і мы ў сваю чаргу таксама стараемся працаваць над фінансавай адукаванасцю людзей.



Зразумела, што ёсць больш уразлівыя пласты насельніцтва — у першую чаргу пажылыя людзі. Мы наведваем тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання, сустракаемся з пенсіянерамі, расказваем ім пра новыя схемы махлярства і пра тое, як пазбегнуць страты сваіх назапашванняў, таму што разумеем: на вуду ашуканцаў у першую чаргу трапляюцца менавіта бабулі і дзядулі. Што да моладзі і людзей сярэдняга ўзросту, сёння ў нашай краіне большасць з іх добра разбіраюцца ў пытаннях кіравання сваімі фінансамі, карыстаюцца інтэрнэт-банкінгам, гатовы разбірацца і асвойваць новыя банкаўскія прадукты. Больш сталым людзям даводзіцца тлумачыць падрабязней. Але ёсць бабулі і дзядулі, якія ў фінансавых пытаннях дадуць фору моладзі! Справа тут у тым, наколькі пажылыя самі жадаюць у гэтым разабрацца. Ёсць катэгорыя людзей, якія не хочуць асвойваць сучасныя банкаўскія прадукты і тэхналогіі і ніколі нават не спрабавалі зразумець. Мы гэта прымаем, бо гаворка пра асабісты выбар кожнага чалавека. Мы не імкнёмся некаму нешта навязаць, проста тлумачым плюсы таго ці іншага банкаўскага прадукту або паслугі.

***— Як вы бачыце сваю кар'еру ў будучыні? Ці ёсць у вас прафесійныя мары, мэты?***

— Не хачу раскрываць усіх сваіх перспектыў, але яны ёсць. Думаю, гэта не апошняя мая прыступка. А ў цэлым бачу шмат кірункаў у прафесіі, у якіх мне хацелася б развівацца. Асвойваць новыя веды, дапамагчы большай колькасці людзей, бо прафесійная дапамога ў фінансавых пытаннях у сучасным свеце важная кожнаму чалавеку і кожнай арганізацыі.

### ПРА ПАЛАТКУ Ў ЛЕСЕ, ВОГНІШЧА І ГІТАРУ

***— А калі казаць пра непрафесійныя мэты і мары?..***

— У мяне іх столькі! Самае галоўнае, што на дадзены момант хочацца зрабіць, але пакуль не хапае часу, — навучыцца іграць на гітары. Акустычны інструмент сабе ўжо купіла, але іграць на ім пакуль не ўмею... Яшчэ хацела б аднавіць заняткі танцамі — асвоіць кірунак, якім я раней не займалася. Напрыклад, мне падаюцца цікавымі ўсходнія танцы, для мяне гэта зусім новая сфера. З дзяцінства займалася харэаграфіяй, і мая прафсаюзная кар'ера пачалася менавіта з яе. На адным з турзлётаў начальніца запрасіла мяне да сябе ў каманду. Мы пераўвасобіліся ў цыганскі табар, і я прадэманстравала свае танцавальныя ўменні... Думаю, працавітасці мяне таксама навучыла харэаграфія. У цэнтры пазашкольнай творчасці ў нас быў цудоўны харэограф, мы займаліся класічнай харэаграфіяй (станком), а таксама кірункамі фолк, мадэрн, элементамі хіп-хопа, народнымі танцамі. Мы былі зоркамі ўсіх гарадскіх мерапрыемстваў і нават ездзілі ў Мінск на танцавальныя вечары ў Ліцэй БДУ. У дзяцінстве ў мяне не было вольнага часу — за гэта трэба сказаць дзякуй маме. Яна распісвала нашы з братам дні. У маім раскладзе былі харэаграфія, макрамэ, я вязала, вышывала, малявала — чаго толькі не рабіла. І, лічу, гэта добра. Цяпер псіхолагі пішуць аб неабходнасці пакідаць дзіцяці вольны час, але мяне «шчыльны графік» навучыў дысцыпліне і пунктуальнасці. У маім дзяцінстве не было такога, каб я не ведала, чым заняцца. Я заўсёды трымала ў галаве дакладны план — маме не даводзілася нагадваць мне мой расклад на дзень. Не, у мяне быў час, каб выйсці пагуляць, але «бадзянні» без мэты — не для мяне, з ранняга дзяцінства і да гэтага часу...

***— Ці ёсць месца стварэнню сям'і ў вашых планах? Скажам так, ці здольныя закахацца банкаўскія работнікі?***

— Вядома, здольныя... Але, шчыра кажучы, не ведаю, як адказаць на гэтае пытанне. Калі я толькі прыйшла працаваць у банк, вырашыла для сябе, што маім прыярытэтам стане кар'ера. Пакуль мне дастаткова таго руху, які адбываецца на рабоце: і ў працоўны, і ў непрацоўны час, у прафсаюзнай сферы. Не, я не адкідаю гэты варыянт — я не мужчыnаненавісніца і не чайлдфры. Аднак лічу, што ўсяму свой час. А ўвогуле, у мяне няма мэты выйсці замуж і ніколі не было. Я не жыла марамі аб белай сукенцы і шыкоўным банкеце. Мне хопіць распісацца ў ЗАГСе, потым палатку дзе-небудзь паставіць на азярцы і проста пасядзець каля вогнішча ўдваіх з мужам. З узростам я станаўлюся чалавекам лесу: аддам перавагу не лакшэры-атэлю, а палатцы ў лесе, вогнішчу і гітары. Мама жартуе: «У табе прачынаюцца мае вясковыя карані».

***— Раскажыце аб вашай працы ў Беларускім саюзе жанчын. Чаму выбралі гэты, «жаночы» кірунак грамадскай працы?***

— Жаночы пачатак — гэта заўсёды пра цяпло, каханне, імкненне дапамагчы і абараніць. Наша банкаўская ячэйка БСЖ аб'ядноўвае людзей з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якія гатовыя нешта мяняць, камусьці дапамагаць, пашыраць межы сваёй свядомасці і свядомасці іншых людзей. Я вельмі паважаю ініцыятыўных людзей — тых, каму не абыякавыя праблемы іншых. Кожны асобна мала што можа зрабіць, але калі такіх людзей шмат, можна горы варочаць. А жанчыны па сваёй натуры ў большай ступені настроеныя ахвяраваць, аддаваць свой час і часцінку душы на нейкую добрую справу. Асноўны напрамак работы нашай ячэйкі БСЖ — дабрачыннасць. Напрыклад, у нас ёсць добрая велікодная традыцыя праводзіць дабрачынны кірмаш унутры калектыву дырэкцыі. Сярод нашых работнікаў шмат таленавітых, крэатыўных людзей — яны шыюць, вяжуць, пякуць, лепяць з гліны або пішуць карціны. Падчас кірмашу ўсе ахвотныя могуць набыць упадабаныя работы. Камусьці, напрыклад, прыйшлася даспадобы ваза, каб упрыгожыць хатні інтэр'ер, хтосьці купляе водарную свечку, каб зладзіць сабе прыемны вечар за кнігай. А атрыманыя сродкі мы накіроўваем на дабрачыннасць. Вывучаем, дзе ёсць патрэба ў сродках, і адпраўляем іх туды — у дзіцячы хоспіс, дом састарэлых ці, напрыклад, у прытулак для жывёл. Таму я люблю работу ў Саюзе жанчын — яна робіць свет лепшым.

***— У вас вялікі аб'ём працы ў самых розных кірунках. Ці знаёмае вам паняцце «прафесійнае выгаранне»?***

— Бывае часам, позняй восенню, хоць гэта хутчэй не «выгаранне», а восеньская хандра. Але мне пашанцавала: побач са мной ёсць людзі, якія не даюць здавацца ні пры якіх абставінах. Гэта і мая сям'я (заўсёды можна прыйсці да бацькоў, каб выгаварыцца), і мае старэйшыя калегі і кіраўніцтва, якія могуць падтрымаць і пераканаць, што не бывае невырашальных працоўных пытанняў. І, вядома, у мяне ёсць мая праца, і мне некалі раскісаць. А ў цэлым, калі задаць сабе пытанне «Ці шчаслівы я чалавек?», то адказ — адназначна «так». Не трэба дзесьці шукаць шчасце, яно заўсёды ўнутры кожнага з нас. Ты прачнуўся, усміхнуўся, сабраўся і пайшоў на працу — нават зыходзячы з гэтага варта сказаць «дзякуй» Богу за новы дзень. Чым больш ты ўсміхаешся свету, тым больш ён усміхаецца табе!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота дадзены гераіняй.**

*Аўдыяверсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.*

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает,**
***что в соответствии с решением наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» от 10 августа 2023 года, протокол № 15, на основании предложения правления ОАО «Белагропромбанк»,***

**14 сентября 2023 года**

## ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ОЧНОЙ ФОРМЕ

**Место нахождения общества и место проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.**

Повестка дня

1. О досрочном прекращении полномочий наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».
2. Об избрании членов наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».

Время начала проведения собрания – 15.00 часов.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 10 августа 2023 года.

Лица, имеющие право на участие в общем собрании, могут ознакомиться с перечнем информации (документов) при подготовке к проведению собрания по адресу: г. Минск, пр-т Жукова, 3, следующим образом:

при регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании, им предоставляются для ознакомления следующие документы:

- проекты решений собрания;
- сведения о кандидатах, выдвигаемых в наблюдательный совет ОАО «Белагропромбанк».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания 14 сентября 2023 года с 14.00 до 14.45 часов при предъявлении документов, подтверждающих их личность и полномочия.

Телефон для справок: 8 (017) 229 64 10.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 10 февраля 2023 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*

---

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ГП «Жилищник Минщины» (арендодатель) проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ТОРГОВОГО ПОМЕЩЕНИЯ,

**инв. № 600/D-123075, общей площадью 182,2 кв. м, расположенного по адресу: Минский район, г. Заславль, ул. Советская, 96-91, для осуществления торговли.**

Срок заключения договора аренды – **3 года.** Размер ежемесячной арендной платы – **136,65 базовой арендной величины** *(без учета коэффициента для отдельных видов деятельности)*.

Аукцион состоится **05.09.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с даты опубликования извещения по **01.09.2023** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11, Телефон для осмотра 017 510 08 53, сайт в сети интернет: www.rlt.by.**

Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах **au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.**

УНП 691536750

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Дата и место торгов** – 01.09.2023 в 11.00, г. Минск, ул. Берута, д. 3Б, оф. 213.

**Продавец** – ООО «Пицари Ленд», УНП 192679441.

**Организатор торгов** – ликвидатор Общества – ИП Рудяк Александр Олегович (тел. 8029-119-86-66).

**Предмет торгов**

**Лот 1.** Хозяйственно-бытовые товары в ассортименте, 18 позиций.

**Лот 2.** Материалы и инструменты для ремонта и строительства в ассортименте, 29 позиций.

**Лот 3.** Гранулят в ассортименте, 4 позиции (списки размещены на сайте банкротство.бел).

**Начальная цена:** Лот 1 – 2 589,30 руб. Лот 2 – 11 694,44 руб. Лот 3 – 10 300,63 руб.

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены.

**Размер задатка**: 10 % от стоимости предмета торгов должен быть зачислен на р/с – ООО «Пицари Ленд», УНП 192679441: BY21REDJ30121003706200100933 в ЗАО «РРБ-Банк», код банка REDJBY22 до 30.08.2023.

**Заявки на участие принимаются по адресу:** 220092, г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 213 до 18.00 30.08.2023 г.

**Требования к участникам, порядок проведения торгов и возмещение затрат по их организации** – в соотв. с постановлением Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16.

**Срок подписания договора, возмещения затрат** – в течение 15 дней со дня проведения торгов.

---

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЧЕТВЕРТЫХ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |
| **Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона)** | Извещение о проведении публичных электронных торгов опубликовано 26.07.2023 в газете «Звязда» № 142 (30022), стр. 14 |

**Четвертые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| **1** | **Хозяйственно-складской участок № 76,** место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102 | 34 272,00 | 9 792,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги» https://iintorgi.by и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **2 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 30.08.2023, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 29.08.2023 г. до 16.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

---

## Информация о проведении аукциона (далее – Аукцион) по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в **аг. Барсуки, ул. Кировская и пос. Дорожный** Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области.

Аукцион состоится **20 сентября 2023 г. в 10.00** в Жодинском сельском исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.

*Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет*

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
